УПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ ГРОДЗЕНСКАГА АБЛВЫКАНКАМА
УПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ ЛІДСКАГА РАЙВЫКАНКАМА
ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ
“СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА № 1 Г. ЛІДЫ”

# ТАЯМНІЦЫ ЛІДСКАЙ ЗЯМЛІ



ЛІДА
2013

ББК 74.585.4
Т 90

Аўтары-складальнікі: члены клуба «Грамадзянін» ДУА «Сярэдняя школа №1 г. Ліды».
Рэцэнзенты: Т.М. Сурконт, настаўніца гісторыі і грамадазнаўства ДУА «Сярэдняя школа №1 г. Ліды».

Т 90 Таямніцы Лідскай зямлі. / [Склад. члены клуба «Грамадзянін»; рэд. Т.М. Сурконт]. – Ліда, 2013. – 106 с.: каляр. іл.

Легенды і паданні – гэта вялікае і разнастайнае багацце, якое ашчадна перадавалася з пакалення ў пакаленне, захавалася да сённяшняга часу і дазваляе глыбей вывучаць мінулае краю. Гэтыя творы народнай спадчыны служаць важным дадаткам дакументальнай гістарычнай інфармацыі, раскрываюць сутнасць тых ці іншых звычаяў, абрадаў. Яны прасякнуты любоўю народа да роднай зямлі, гатоўнасцю абараніць яе, у іх гучыць захапленне майстэрствам людзей працы, нянавісць да прыгнятальнікаў, імкненне да дабра і справядлівасці, асуджэнне зла, хітрасці і хлусні, мара аб шчаслівым і радасным жыцці.

У зборнік уключана 69 легендаў і паданняў Лідскай зямлі – 26 твораў па Лідзе і 43 па Лідскаму раёну. Выданне ілюстравана фатаграфічнымі матэрыяламі і малюнкамі вучняў СШ №1.

Разлічана на шырокія колы грамадства – усіх тых, хто цікавіцца мінулым сваёй малой Радзімы.

ББК 74.585.4

© Дзяржаўная установа адукацыі
«Сярэдняя школа №1 г. Ліды», 2013

ЗМЕСТ

ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ ГОРАДА ЛІДЫ ... 7
**Пра паходжанне назвы горада** ... 7
ЛІДА ... 7
ЛІДА ... 9
ЛЕГЕНДА АБ ПАХОДЖАННІ НАЗВЫ ГОРАДА ... 14
АРЛІНАЕ ГНЯЗДО ... 15
ЛІЗДЗЕЙКА З-НАД ЛІДЗЕЙКІ ... 16
ЗОРНЫ ДАР ... 17
**Пра Лідскі замак і яго ваколіцы** ... 18
БУДАЎНІЦТВА ЛІДСКАГА ЗАМКУ ... 18
ЯК ЛЮДЗІ ЗАМАК БУДАВАЛІ ... 19
ДЗВЕ САСНЫ ... 20
СОСНЫ ЛЯ ЛІДСКАГА ЗАМКА ... 21
О ЛИДСКОМЪ ЗАМКѢ ... 21
КАРАЛЕЎСКІ ЎЕЗД Ў ЛІДСКІ ЗАМАК ... 22
ПРЫВІДЫ ЛІДСКАГА ЗАМКА ... 23
ТАХТАМЫШАЎ СКАРБ ... 23
**Пра гістарычныя падзеі і гістарычных дзеячаў** ... 24
ЧАМУ НА ЛІДСКІМ ГЕРБЕ ЛЕЎ? ... 24
БЫЛО ГЭТА Ў ЧАСЫ... ... 24
ВУЛІЦА ЛЕГЕНДАРНАЙ ГРАЖЫНЫ ... 25
"І БУДЗЕ ІГРАЦЬ МУЗЫКА НА МОГІЛКАХ НЕМАЎЛЯТ ..." ... 26
ЯК ЯЎРЭІ ПЕРАЙШЛІ Ў ПРАВАСЛАЎЕ ... 26
**Пра узнікненне і паходжанне назвы рэк, азёраў, крыніц** ... 27
ЖЫВАТВОРНАЯ КРЫНІЦА ... 27
РАКА ЛІДЗЕЙКА ... 28
АСІЛКІ ... 28
ЛІДСКАЕ ВОЗЕРА ... 29
**Пра сацыяльныя адносіны** ... 29
ЗАКАСАНКА ... 29
СЛАБАСЦІ ЗАРАЧАНЦАЎ ... 30
**Заагенічныя легенды і паданні** ... 30
ЧАМУ САБАКА НЕ ЛЮБІЦЬ КАТА, А КОТ НЕ ЛЮБІЦЬ МЫШЭЙ ... 30
ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ ЛІДСКАГА РАЁНА ... 31

**Пра паходжанне і назвы вёсак, мясцін** ........ 31
БЕЛІЦА ........ 31
БЯРОЗАЎКА ........ 31
ГУДЫ ........ 37
ДВОРЫШЧА ........ 38
КРУПАВА ........ 39
КРЫНІЦА ........ 41
ЛЕСНІКІ ........ 44
М. ЛЕБЕДЕВО ........ 46
МАЦЭВІЧЫ ........ 47
МІНОЙТЫ ........ 49
МІНОЙТЫ ........ 50
МЫТО ........ 50
МЫТО ........ 51
ЦАЦКІ ........ 51
ЭЙТУНЫ ........ 51
**Пра паходжанне і назвы азёраў, рэк** ........ 52
ВОЗЕРА НЕДАЛЁКА АД ВЁСКІ ПЕСКІ ........ 52
ВЯЛІЧКАЎСКАЕ ВОЗЕРА ........ 52
КСЕНДЗОВА ВОЗЕРА ........ 53
НЁМАН І ЛОША ........ 53
ЯК НАРАДЗІЛІСЯ НЁМАН І ЛОША ........ 55
**Пра гістарычныя падзеі і гістарычныя асобы** ........ 55
ДВАРЫШЧАНСКАЯ БАШНЯ – СВЕДКА ЖОРСТКАГА ЗАБОЙСТВА ........ 55
ШВЕДСКАЯ ГАРА ........ 56
ЯК СЦЕРКАЎСКІ СОЛТЫС З БЕЛАРУСКАЙ СЯЛЯНСКАЙ ГРАМАДОЙ ЗМАГАЎСЯ ........ 56
**Пра цэрквы, касцёлы і іншыя святыні** ........ 57
АБРАЗ БОЖАЙ МАЦІ Ў БЕЛАГРУДСКІМ КАСЦЁЛЕ ........ 57
АБРАЗ У МЫТО ........ 57
АБЯРЭГІ АД ХВАРОБЫ ........ 59
КАМЕНЬ-СЛЕДАВІК У БАБРАХ ........ 59
КАПЛІЦА Ў ЦВЕРМАХ ........ 59
КАПЛІЧКА ЛЯ ЦВЕРМАЎ ........ 61
СВЯТАЯ КРЫНІЦА НА КАЦЯРЫНІНСКІМ ТРАКЦЕ ........ 62

ФАМІЛЬНАЯ ЎСЫПАЛЬНІЦА МАЎРАСАЎ У ТАРНОВА .......... 63
ФІГУРКА ІІСУСА ХРЫСТА НА СТАРЫХ МОГІЛКАХ У ДВОРЫШЧАХ .......... 63
ЦАРКВА Ў ДЗІКУШКАХ .......... 64
ЦУДОЎНЫ СКАРБ У ЗБЛЯНАХ .......... 64
ЧОРТАЎ ЗАПАЛЬНІК І БОЖЫ ТУШЫЛЬНІК .......... 65
**Пра праявы злых (цёмных) сіл** .......... 65
ВЯДЗЬМАРСКАЕ НАКЛЯЦЦЕ .......... 65
САТАНА ГАВОРЫЦЬ У ДЗЯЎЧЫНЕ .......... 65
**Пра сацыяльныя і сямейна-бытавыя адносіны** .......... 66
“КЛЭЎСЯЎ КУТ” .......... 66
“КУМАЎІНАЯ ЯМА” .......... 66
НЯМА ГОРШАЙ КАРЫ, ЯК У ПРЫМАХ .......... 67
“НУ, КАЗЛОЎСКІ! Я Ж НЕ СПАДЗЯВАЎСЯ!” .......... 67
“СЕНЧЫКАВА РАЗОРКА” .......... 68
“ХЛОПЧЫКА НАЗАВІ АДАМАМ, А ДЗЯЎЧЫНКУ ЕВАЙ” .......... 68
ЛІТАРАТУРА .......... 69
ДАДАТАК 1 .......... 71
ДАДАТАК 2 .......... 72
ДАДАТАК 3 .......... 73
ДАДАТАК 4 .......... 74
ДАДАТАК 5 .......... 76
ДАДАТАК 6 .......... 77
ДАДАТАК 7 .......... 78
ДАДАТАК 8 .......... 79
ДАДАТАК 9 .......... 80
ДАДАТАК 10 .......... 81
ДАДАТАК 11 .......... 81
ДАДАТАК 12 .......... 83
ДАДАТАК 13 .......... 84
ДАДАТАК 14 .......... 85
ДАДАТАК 15 .......... 85
ДАДАТАК 16 .......... 86
ДАДАТАК 17 .......... 87
ДАДАТАК 18 .......... 88
ДАДАТАК 19 .......... 89

ДАДАТАК 20 ........ 90
ДАДАТАК 21 ........ 91
ДАДАТАК 22 ........ 93
ДАДАТАК 23 ........ 94
ДАДАТАК 24 ........ 96
ДАДАТАК 25 ........ 97
ДАДАТАК 26 ........ 97
ДАДАТАК 27 ........ 98
ДАДАТАК 28 ........ 101
ДАДАТАК 29 ........ 102
ДАДАТАК 30 ........ 103
ДАДАТАК 31 ........ 104

## ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ ГОРАДА ЛІДЫ

### Пра паходжанне назвы горада

### ЛІДА

У сутоку двух рэк, Лідзеі і Каменкі, - там, дзе на забалочаных прасторах некалі раслі густыя непраходныя лясы, перад імі на высокім узгорку стаяў замак. З вышыні яго вежаў позірку адкрываўся прыгожы від на даліну, працякаючай побач выгібам ракі. Гаспадаром замка быў яго заснавальнік літоўскі князь Гедымін. Была ў яго прыгажэйшая тварам з чорнымі і густымі, быццам крыллі ворана, валасамі, з чорнымі, як вугалькі вачыма, дачка. Прыгажосцю дзяўчыны любаваліся ўсе, пачынаючы з заможных, у якіх недахопу не было, канчаючы простым людам. Простыя сяляне, якія жылі паблізу замка, вельмі любілі Ліду, так звалі гэтую дзяўчыну, за яе добрае спагадлівае сэрца.

У пагодлівыя сонечныя дні, у беласнежнай сукенцы са сплеценым з палявых кветак вянком на галаве і ў акружэнні слуг, яна, быццам матылёк, пырхала на расквечаных лугах і пашы. Выглядзела пры гэтым дзівосна: як вясна, якая як заўсёды прыходзіць пасля доўгай і суровай зімы, прыносячы радасць і спакой. Бачачы яе, людзі спыняліся як завароженыя. А яна як быццам гэтага не заўважвала. Перабягала Ліда праз зялёныя аазісы, шчабечучы як птушка, якая толькі што вылецяла з гнязда, вызваліўшыся з-пад матчынай апекі.

Час хутка ішоў. І не паспела Ліда аглянуцца, як стала стройнай, рослай і прыгожай дзяўчынай на выданні.

“Ужо пара табе замуж, любімая дачушка, - сказаў аднойчы бацька. - Ты ўжо зусім дарослая дзяўчына”.

“Мне гэта нават яшчэ ў галаву не прыходзіла, - адказала Ліда. - Я яшчэ зусім маладая. Ці ж я добраахвотна павінна адмовіцца ад чароўнасці гэтага прыгожага свету? А ці магу я даведацца, хто ж будзе маім суджаным?” - нясмела спытала яна бацьку.

“Гэта ўплывовы і прыстойны пан, які мае вялікія заслугі перад краем, багаты і разумны”. - Бацька назваў імя суседскага князя, вядомага сваім старэчым узростам і не менш непрыемным вонкавым выглядам.

“Хто?! Гэты старэнькі?!... Сумлення ў цябе, бацька, няма!”

“Лепшай партыі табе не знайсці. Ён багаты, прыстойны і любіць цябе”.

“Але ж я яго зусім не люблю! Не пайду за яго!”

“Павінна!” - сказаў, як адрэзаў бацька.

“Бацька, злітуйся, пашкадуй!” - з мальбой у голасе вымавіла Ліда. Але той застаўся няўмольным.

З гэтага часу прайшло некалькі месяцаў. Вада ў рэках замёрзла, зямля змерзлася, дрэвы без лісцяў замерлі ў нерухомасці, а снежны покрыў услаў даліны і ўзгоркі.

А калі вясной яблыні пусцілі розавыя бутоны кветак, сцеблі свежай зялёнай травы падняліся ўвысь; а сонца цёплымі праменнямі абхапіла ў свае абдымкі сады і палі, каля варот замка спыніўся атрад. Сумнення не было - прыехаў жаніх.

Князь Гедымін прыняў госця з вялікай пашанай. Тры дні ламаліся сталы ад прысмакаў і цудоўных напіткаў. Тры дні працягваўся пір і ігралі музыкі.

Увесь гэты час Ліда сядзела ў сваёй святліцы, праводзячы дні і ночы ў глыбокім задуменні. Не адна сляза скацілася па яе бледным твары. Не дапамагалі ні суцяшэнні прыдворных, ні ўгаворы самай любімай яе няні. Не дапамагалі мальба і заклінанні маці, ні перасцярога бацькі. Ліда зацялася. Не хацела ні з кім размаўляць, не прымала ежу, толькі шаптала словы малітвы.

“Загрызе сябе да смерці”, - шапталі па кутах прыдворныя.

“Памрэ з голаду нябога”, - ламала рукі няня.

Настаў трэці дзень гуляння. Скончыўся пір. Седзячы каля акна, Ліда пачула знаёмыя крокі бацькі і бразганне зброі. Сумнення не было: разам з бацькам ішоў жаніх.

Не чакаючы гасцей, праслізгнула яна праз кутыя жалезам дзверы і праз лабірынт калідораў і дзвярэй, паднялася на замкавую сцяну. Як звычайна ў белай сукенцы, стала, выпрасталася. Вецер ласкава іграў складкамі яе сукенкі, развяваў доўгія чорныя валасы. Падняўшы высока непакорную галаву, Ліда ахапіла позіркам знаёмыя з дзяцінства палі, лясы, лугі і кветкі, якія яна палюбіла ўсім сэрцам. У апошні раз услухалася ў шчабятанне птушак, шум ветру і меладычны голас іграючай дзесьці жалейкі. Развітвалася з навакольным светам і жыццём.

Дарэмна беглі да яе ўстрывожаныя прыдворныя. Дарэмна клікаў у адчаі бацька. Ліда яшчэ раз зірнула навокал і кінулася са сцяны ў воды працякаючай побач ракі.

Доўга аплакваў Ліду ўвесь двор і, перш за ўсё, просты люд. Расказ аб яе самаахвярнасці ў імя кахання перадаваўся з пакалення ў пакаленне і дайшоў да нашых дзён. Расказваюць, што ў цёплыя вясеннія ночы, калі расцвітаюць сады, а месяц ярка асвятляе замкавы груд, у срэбным яго святле на сцяне замка з’яўляецца постаць Ліды, прыбраная ўсё ў тую ж белую сукенку са сплеценым з палявых кветак вянком на галаве. Узняўшыся ва ўвесь свой рост, яна аглядае ўсё навокал, а на золку знікае.

Далей легенда сцвярджае, што Гедымін усвядоміў сваю непапраўную памылку і ў памяць аб любімай прыгажуні - дачцы назваў горад Лідай, а раку, у якой яна ўтапілася, - Лідзеяй. *(Дадатак 1)*

*(Кулеш, А.Ф. Горад Ліда: гісторыя, легенда, факты. – Ліда, 1994)*

Як не прывабна назву горада звязваць з прозвішчам прыгожай князёўны, аднак гэта не будзе адпавядаць рэчаіснасці. Справа ў тым, што імя Лідзія старагрэчаскага паходжання, вельмі рэдкае ў старажытнасці, на беларускіх землях распаўсюдзілася толькі ў XIX ст., калі наш горад ужо даўно існаваў.

## ЛІДА

У адной нёвялічкай вёсачцы, што тулілася на беразе безыменнай рэчкі, сярод густога-густога лесу, жыла ў даўнія часы сівая бабулька. Яе дзеці разляцеліся па свеце, муж памёр, перажыла яна і сваіх сяброўак, таму ў госці совалася да маладзейшых, а тыя добра разумелі настрой самотнай бабулькі і ніколі не гналі прэч.

Затое зімой ды позняй восенню ў яе хаціне хлопцы ды дзяўчаты наладжвалі вячоркі.

Сярод моладзі вылучалася Лідзея. Яе бацькі памерлі, узгадавалася бедалага ў дзеда з бабкай, ды і тыя пакінулі свет гэты. Таму гаспадыня надта добра да яе ставілася і неаднойчы прапаноўвала заставацца пасля вячорак у яе.

І тут размовы вяліся да світанку. Гаспадыня найбольш распавядала пра колішняе жыццё, а Лідзея слухала. Праўда, апошнім часам яна нешта нервавала. Бабуля не дапытвалася, чакала, пакуль тая сама пра ўсё раскажа. Так яно і здарылася.

Пасля чарговых вячорак дзяўчына засталася ў бабулькі, моўчкі зачыніла дзверы, задзьмула лучынку і палезла да гаспадыні на печ. Але на гэты раз не стала нецярпліва прасіць расказаць што-небудзь цікавае, а прыхілілася да старой плячыма і заплакала. Ды так горка, так жаласліва, што бабулька ажно спалохалася:

- Што гэта з табой, унучанька ты мая? Скажы, хто цябе гэтак пакрыўдзіў?

- Ніхто мяне не пакрыўдзіў, - адказала тая, а сама яшчэ мацней плакаць стала.

- Нешта ж здарылася. Распавядзі мне, можа, я чым і дапамагу.

- Ды мне сорамна, бабулька.

-Ты ўжо і мяне саромецца пачала? Расказвай, не цягні час, то да раніцы што-небудзь і прыдумаем.

- Толькі вы не смейцеся, добра?

- Абяцаю. Калі хочаш, то і перажагнаюся.

- Мне крыўдна, што ніводзін хлопец на мяне не звяртае ўвагі, ніводзін дамоў не правёў. Што гэта? Ці мне проста ў жыцці не шанцуе, ці лёс такі, ці яны маёй беднаты палохаюцца?

- Не перажывай, унучка, не перажывай, міленькая, твой час яшчэ наперадзе. Каханне не выбірае, багаты ты ці бедны. Проста настане той момант - і ўсё, нібы табе сілай нешта ў сэрца ўвальюць.

- І ў вас так было? - ціхенька запыталася дзяўчына.

- І ў мяне, і ва ўсіх людзей. І ў цябе ўсё складзецца добра. Праз пару вечароў і ў цябе хлопец з'явіцца, і для цябе ён будзе прыгажэйшы за астатніх. Каханне слепіць. А зараз спі, набірайся сілы.

І што вы думаеце? Спраўдзіліся словы бабулькі - у Лідзеі з'явіўся хлопец. А атрымалася вось як.

Сабраліся дзяўчаты з хлопцамі, як і раней, на вечарынку. Паселі, песні заспявалі, і тут да Лідзеі падсеў прыгажун, якога ўсе дзяўчаты позіркамі заўсёды праводзілі.

Пачаў гаманіць, а тая ад радасці і гаварыць не ведала што. Потым асмялела і стала таксама жартаваць. Андрэй - так звалі хлопца - і дамоў яе правёў. Толькі не ўспалася Лідзея адна, прыбегла да бабулькі, ускочыла на печ і давай гаварыць:

- Бабулечка, родненькая, адкуль ты ўсё ведала? Ён такі прыгожы, такі моцны, такі разумны - разумнейшага за яго на свеце белым не знойдзеш...

- Вось бачыш, адзін раз ты з ім пагаманіла, а ўжо колькі добрага пра хлопца кажаш. А што скажаш праз год ці паўтара? Беражы, унучка, сваё шчасце, бо ўсё можна купіць, а шчасця ды здароўя - не.

- Цікава, хто ён такі, адкуль родам. Нашы кажуць, Што не тутэйшы.

- Можа, ты так ужо і не спяшайся. Прыгледзіцца да цябе - сам усё і раскажа.

- Але ж мне карціць хутчэй даведацца...

- То вазьмі ды прасачы за ім. Куды ён пойдзе - туды і ты ідзі, толькі глядзі, каб нё заўважыў.

- Я паспрабавала было сёння, але ён нібы пад зямлю праваліўся.

- Тут я табе, унучка, дапамагу. Прывяжы кончык ад гэтага клубочка чорных нітак да кажушка свайго хлопца. Ён пойдзе пасля вячорак дамоў, а ты раніцай па нітачцы і дабяжыш туды...

Ледзьве дачакалася дзяўчына хлапчыну ў той дзень, усе вочы прагледзела. Нарэшце ўбачыла - цісне ён напрасткі, тады і яна на падворак выбегла, нібыта па нейкай патрэбе. Сталі размаўляць, а потым Лідзея запрасіла яго зайсці ў хату, і той з радасцю пагадзіўся. Пачала яна распытваць хлапчыну, адкуль ён родам, хто яго бацькі, але ўбачыла, што ён не хоча шчыра адказваць, усё круціць.

- Што гэта ты сёння такі сумны?

- Ды настрой нешта сапсаваўся...

- Ад чаго?..

- Калі шчыра, то і сам не ведаю.

Так гаманілі маладыя, не заўважаючы, што вечар ужо даўным-даўно гаспадарыў на вуліцы. Потым хлопец схамянуўся і пачаў дамоў збірацца.

- Можа б яшчэ крышачку пасядзеў, - прапанавала Лідзея, а то мне адной сумна.

- Не магу, трэба дамоў вяртацца. Пакуль дайду - ноч ужо будзе. Я лепей заўтра да вас на вячоркі прыйду.

- Прыходзь, буду чакаць, - нібыта сумуючы, адказала дзяўчына, а сама непрыкметна прывязала канец ніткі ад клубочка за кажушок...

Гопнулі глуха дзверы, і хлапчына пайшоў. Дзяўчына засталася дома, і нечага страшна ёй зрабілася, нешта на душы не тое стала. Залезла яна на палок, а ад страху зубы ляскочуць. Тады запаліла агеньчык на прыпеку, ён яе супакоіў. Заснула. Прачнулася позна, калі на двары ўжо было відно. Выскачыла за парог, а слядоў нябачна - снегу навaліла. Тады згадала Лідзея пра нітачку. Глянула ля вядра з вадой, дзе клубочак той паклала, а там саменькі кончык застаўся, яшчэ б нейкі сажань - і адцягнуў бы яго хлопец за сабой.

Ледзьве дачакалася дзяўчына змяркання, узяла за нітачку, паціху яе са снегу выцягнула і пайшла. Спачатку хлапчына кіраваў на суседнюю вёсачку, якая таксама ў лесе знаходзілася, але праз колькі крокаў нітачка пацягнула зусім у адваротны бок, туды, дзе раскінулася гнілое балота, а на выспе, не даходзячы блізка да яго, ляжалі вясковыя могілкі. Тут ужо было не да жартаў. Лідзея спынілася. Не было з кім параіцца. Пакруцілася на месцы і вырашыла сачыць далей.

Тым часам змрок запанаваў над абшарамі. Лідзея ішла, трымаючыся за нітачку, нібы за кій, якім можна было і абараніцца ў выпадку чаго. Дзяўчына ляскала зубамі са страху, але ўпарта сунулася наперад.

Нечакана з цемры паўсталі вялікі крыж, а за ім драўляная каплічка, якую звычайна ўзводзяць на могілках сяляне, каб там пазваніць у звон, калі нябожчыка хаваюць, ці яшчэ якую нагоду справіць. Лідзея супынілася і торгнула за нітку. Тая нацягнулася, нібы струна. Андрэй недзе зусім блізка. Шуснула яна за елачку і не дыхае. А вецер свішча, мароз мацнее, крумкачы не спяць, голас свой жахлівы падаюць і, здаецца, падказваюць нячысцікам, дзе схавалася Лідзея. Тым часам рыпнулі дзверы каплічкі, і на парозе з'явіўся невыразны цень. Пастаяў хвіліну-другую і зрабіў крок наперад. Калі ён параўнаўся з дзяўчынай, тая ледзьве не закрычала - гэта быў не хто іншы як Андрэй!

Дачакалася бедалага, пакуль ён далей адыдзецца, і зазірнула.ў сярэдзіну будыніны. У каплічцы цёмна, хоць ты вока выкалі. Пачала рукамі шукаць вугельчык

каб яго раздзьмуць і агеньчык зацепліць. Калі святло выхапіла з цемры сцены і куты невялічкай будыніны, то дзяўчыне ажно галаву закружыла - з усіх бакоў на яе пазіралі, страшна ашчэрыўшыся, чарапы. Іх было многа, можа, пяць дзесяткаў, а можа, і сотня. Як ламанула Лідзея адтуль бегчы, то толькі вецер у вушах засвістаў! Куды і стома тая падзелася. Але, праляцеўшы, можа, з вярсту, апамяталася: ён жа зараз агледзіцца, што яе на вечарынцы няма, і падасца ці шукаць, ці дамоў. І вяртацца будзе па гэтай дарозе... Толькі яна збочыла крыху і сцішыла свой бег, як зусім недалёка ўбачыла Андрэя, які крочыў да сваёй каплічкі.

Прыбегла Лідзея не дамоў, а да бабульчынай хаціны і давай у акенца стукаць:

- Бабулька, родненькая, адчыні! Адчыні хутчэй, бо баюся, што ён мяне дагоніць!

- Што з табой, унучка? - адчыніўшы, спыталася гаспадыня.

Распавяла тая, дзе была, што бачыла. Спахмурнела старая:

- Чула я некалі такую ж гісторыю. Яе мне матуля-нябожчыца расказвала. Пра адну дзяўчыну, якая на ўласнай шкуры зведала сувязь з нячыстай сілай. Дрэнна для яе ўсё скончылася, ой як дрэнна...

- А што здарылася?

- Безумоўна, хлопец гэты ніякі не хлопец, а пераўвасоблены нячысцік. Лазіць ён за табой ды спрабуе сваімі чарамі на цябе ўздзейнічаць, каб потым што благое зрабіць. Сцеражыся.

- Але ж ён цяпер ад мяне не адчэпіцца. Ведае, дзе я жыву, ведае, што ён мне падабаецца. Як жа ад нячысціка ўратавацца?

- Можна ўратавацца. Пажывеш у мяне першы час, бо дома ён цябе вельмі хутка знойдзе, і тады ўжо ніхто не дапаможа. А ў мяне ёсць стары знаёмы, ён і раней часам дапамагаў, асабліва ў безвыходных сітуацыях. Раніцай схаджу да яго, папрашу заступніцтва - не павінен адмовіць. А зараз залазь на печ ды паспі. Не бойся. Я ў хаце, таму ніякі чорт сюды не палезе.

Гаспадыня як сказала - так і зрабіла. З самае раніцы пайшла да таго чалавека і распавяла пра ўсё, што адбывалася апошнім часам з Лідзеяй. Той уважліва выслухаў, а потым, хітравата прыжмурыўшы вока, звярнуўся да бабулькі:

- Хіба ты не памятаеш, як у наш час з нячысцікам распраўляліся?

- Што ты, чалавеча, адкуль я магла ведаць?

- Тады слухай і ўсё зрабі так, як я табе скажу, бо калі нешта перайначыш - быць бядзе, і абрынецца яна на таго, хто пойдзе нячысціка са свету зжываць. Дам я табе пару карэнняў вялікіх, пару голек кусцікаў, якія толькі я ведаю, ды ўсялякіх зёлак. Звары ўсё гэта на малым агні ў трох водах. Потым злі вар у пасудзіны, астудзі і перамяшай. З

сабой неабавязкова ўсё несці, дастаткова і невялічкай пасудзіны. Дачакайся, калі заспявае трэці певень, і ў той самы момант пакрапі жытло нячысціка. Неабавязкова, каб ён сам там знаходзіўся. Гэтыя траўкі на іх моцна дзейнічаюць. Калі чорт закране рукой акроплены вадой прадмет, то павітаецца з уласнай смерцю, тут яму і ўсё. Толькі памятай: ні ў якім разе нельга спачуваць нячысціку, бо канаць ён будзе ў чалавечым аблiччы. Нельга рэагаваць на ягоныя крыкі ды стогны, плач ды слёзы, бо калі ў душы з'явіцца жаль да яго, то гэтая вадзіца пачне дзейнічаць і на цябе. А назад ён са сваіх лап нікога ніколі не выпускае. І яшчэ: нельга палохацца.

Падзякавала бабулька свайму сябруку і пакіравала дамоў, каб належным чынам падрыхтавацца да расправы з нячысцікам.

- Вылазь, унучка, знайшла я ўправу на твайго кавалера-нячысціка, - з парога гукнула яна Лідзеі, - зараз мне дапамагаць будзеш, а я раскажу, як усё зрабіць. Запамінай добра, каб не пераблытала, бо мяне ж побач не будзе...

Доўга варылі дзівосны ўзвар старая і маладая, шаптала бабуля парады, а Лідзея ўважліва слухала.

Вырашылі, што сама лепш ад нячысціка пазбавіцца падчас чарговай вечарынкі. Ён жа абавязкова пойдзе шукаць Лідзею, а тая дачакаецца зручнага моманту непадалёку ад каплічкі і зробіць усё як мае быць.

Вось надышоў той дзень, і Лідзея пайшла да патаемнага месца, адкуль прыходзіў да яе Андрэй-нячысцік. Засела непадалёку і стала цярпліва чакаць. Нарэшце Андрэй выйшаў з каплічкі, але, пастаяўшы крыху на парозе, вярнуўся назад. Дзяўчына ледзьве не закрычала з адчаю. Што ёй, бедалазе, рабіць, калі нячысцік не пойдзе ў вёску? Ды Андрэй, нібы пачуўшы маленні Лідзеі, зноў выйшаў і пацiху падаўся да вёскі. Дзяўчына нейкі час чакала, а потым уляцела ў каплічку і давай ва ўсе бакі сваім чароўным узварам пырскаць, а напаследак яшчэ і дзверы добра змачыла, нават клямку і тую не забылася. Усё, здавалася б, правільна зрабіла, але не пабегла дамоў, як яе вучыла бабулька, а вырашыла паглядзець на ўласныя вочы, хто ж гэта да яе хадзіў і які ён на самай справе. Доўга сядзела, закалела ўся, але дачакалася, калі гаспадар каплічкі дамоў вярнуўся. Ішоў ён невясёлы, але спяшаўся, бо крык пеўня для яго быў, што смерць. Ухапіўся за клямку і адразу ж закрычаў:

- А-а-а! Высачыла! Да смерці мяне давяла! - і тут у таго, хто зваўся Андрэем, вопратка з плеч ападала і валасістая шкура праглянула. Спалохалася Лідзея і кінулася бегчы. Ды пераблытала і пабегла не ў бок вёскі, а ў супрацьлеглы, а галоўнае - азірнулася. А гэтага ж нельга было рабіць! Не паспела яна пад ногі глянуць і шуснула ў

палонку, якую ці то рыбакі прабілі, ці то не замярзала там вада ўвогуле. Нават крыкнуць не паспела, захлынулася адразу.

Доўга чакала дзяўчыну бабуля, а потым папрасіла хлапцоў ды мужчын пашукаць яе. Тыя ўсё навокал аблазілі і знайшлі тую палонку. Вада ў ёй была стаячая і чырвоная. Калі вясной лёд узламаўся і пабеглі раўчукі, то і рэчка тая абудзілася, але цяпер яе людзі звалі... Лідзеяй. Так яна і засталася ў памяці. Праўда, некаторыя клікалі больш ласкава - Лідзейка, таму і паселішча на высокім беразе назвалі Ліда. Але тут ужо невядома дакладна, ці то ад той невялічкай рэчкі, дзе дзяўчына смерць знайшла, ці то ад дзявочага імя. *(Дадатак 2)*

*(Гродзеншчына: Назвы населеных пунктаў паводле легендаў і паданняў (Склад., запіс., апрац. А.М.Ненадаўца). - Мн.: Беларусь, 1999.)*

## ЛЕГЕНДА АБ ПАХОДЖАННІ НАЗВЫ ГОРАДА

Топонимика объясняет, что слово “Лида” происходит от литовского слова “лидум” (болото).

А легенда другие вести
Донесла к нам из уст в уста:
Лет семьсот, как на этом месте
Жил-был бортник по имени Стах.
Пчёл смотрел, знал все тайны пущи,
Как никто натягивал лук,
И во всём помощником лучшим
Был сынок его младший Янук.
От медов ли светлых и тёмных,
Иль от воздуха, что был чист.
Вырастал мальчишка проворным,
Не по возрасту был плечист.
Не по возрасту, он всё ведал,
Всё стремился вдаль, и ввысь,
Сам в четырнадцать взял медведя,
А в пятнадцать — болотную рысь.
А когда летел на дрыкганте,
Никого, ничего не боясь,
Говорили встречные “Гляньте,
Вырос Муромец в наших краях!”

Головой доставал до осинок,
Гладил косы берёзовых крон,
К восемнадцати стал исполином:
И пригож, и могуч, и умён.
Небеса голубые и синие
Мыли землю весенними ливнями
В эти дни повстречал Ясь девчину,
Звали Лидой, а стала любимой.
До села её — вёрст с десяток,
Но как солнце землю увидит,
Громовым раздавалось раскатом:
“С добрым днём! С добрым утром, Лида!”
А как сжали житнёвый колос,
Ясь привёл к себе в дом подругу
И почти целый век тот же голос
По утрам поднимал округу.
На дыбы вздымались олени,
И стыл тур, как каменный идол,
А крестьяне окрестных селений
Это место назвали Лидой.
Вот откуда, лидчане, мы родом,
Мох забвенья того не обвил,
Что наш город рождён не болотом
А возник от великой любви.

*(Тополь, А. Легенда. // Лідская газета. – 1980. - 16 лістапада.)*

## АРЛІНАЕ ГНЯЗДО

...Ужо некалькі гадоў вялікі князь Гедымін кіраваў Вялікім княствам Літоўскім у Навагрудку. Усе гэтыя гады прайшлі ў цяжкіх вайсковых паходах супраць іншаземных ворагаў. На поўначы княства не было ніводнага абарончага збудавання супраць крыжакоў. Гэта потым будуць пабудаваны Віленскі, Трокскі і Крэўскі замкі; а зараз за Нёманам толькі лясы і балоты.

Гедымін любіў Прынёманскі край: у рэках і азерах было шмат рыбы, у лясах - дзікіх звяроў. Таму між вайсковымі паходамі князь часта праводзіў час на паляванні. Паляванне, акрамя вайсковых паходаў, тады лічылася сапраўдным мужчынскім

заняткам. Вось і зараз, набіўшы шмат дзічы, Гедымін вяртаўся ў Навагрудак. Конь Гедыміна стаміўся, і князь вырашыў напаіць яго, убачыўшы наперадзе невялікую раку. Падышоўшы да яе, Гедымін пачуў дзіцячы плач. Паглядзеўшы навокал, князь убачыў вялікі дуб, а на ім арлінае гняздо, вось адтуль і гучаў плач. Гедымін загадаў сваім падначаленым зняць з дрэва дзіця, і калі вярнуўся ў Навагрудак, аддаў хлопчыка на выхаванне ў княжацкі двор. Так як дзіця было знойдзена ў гняздзе (па- балцку — Lizdas), то хлопчыка празвалі Лідзейка. Лідзейка хутка рос і стаў адрозніваецца ад усіх дзяцей. Ён тлумачыў сны, меў здольнасці да прадказання. Усё гэта паспрыяла таму, што Лідзейка стаў вярхоўным жрацом Вялікага княства Літоўскага.

Аднойчы Гедымін вяртаўся з паўночнага паходу. Адпачынак прызначыў на ўзвышшы над ракой Вільня. Ноччу князь убачыў сон, што на гары стаіць жалезны воўк і раве, як сотня ваўкоў. Гедымін папрасіў жраца растлумачыць сон. Лідзейка сказаў: “Воўк жалезны, значыць горад - сталіцу, а тое, што ён раве, як сто ваўкоў, значыць, аб славе горада будзе ведаць увесь свет”. Так паўстала сталіца ў будучым мацнейшай еўрапейскай дзяржавы Вялікага княства Літоўскага — Вільня.

Вярхоўны жрэц Лідзейка паспрыяў выбару месца для новай сталіцы. Думаў Гедымін, як падзякаваць Лідзейку, і вырашыў пабудаваць замак на тым самым месцы, дзе знайшоў калісьці маленькага хлопчыка на дрэве ў арліным гняздзе.

Шмат часу прайшло, і па сённяшні дзень мы бачым падзяку Вялікага князя Гедыміна галоўнаму жрацу ВКЛ Лідзейку — прыгожы моцны замак, каля якога цячэ рака Лідзейка. А ўсе мы, лідзяне, з'яўляемся жыхарамі Ліды — жыхарамі “арлінага гнязда”.

*(Беркус, С. Арлінае гняздо. // Принеманские вести. - 2008.- 10 января.)*

## ЛІЗДЗЕЙКА З-НАД ЛІДЗЕЙКІ

*Аднойчы на паляванні князь Гедзімін*
*знайшоў у арліным гняздзе малога хлопчыка.*
*Яго назвалі Ліздзейкам. (Lizdas па-балцку -*
*гняздо). Пазней Ліздзейка стаў галоўным*
*вешчуном ВКЛ. Зусім верагодна, што назва*
*горада Ліда паходзіць ад гэтага слова Lizdas.*

Раз у пушчу, за даліну
На краі Дайновы
Почат князя Гедзіміна
Выехаў на ловы.

І на дубе, на высокім,
Між крывых галінаў
Нешта ім упала ў вока
На гняздзе арліным.
Князь паслаў туды пахолка,
І ён з дуба тога
Ўніз даставіў спрытна-лоўка
Хлопчыка малога.
- Бачыш ты, як ён высока
Ўжо "ўзляцеў" з радзінаў,
Будзе шлях яму далёкі
Побач з Гедзімінам...
А з таго, што на гняздзе тым
Хлопца адшукалі,
Імя годнае Ліздзейка
Ўраз яму надалі.
І мясціну тую Лідай
Наракалі адразу,
Праз гады тут стане Ліда
З вышняй волі князя.
А пасля пачнуць калейкай
Баяць казкі людзі...
... Пра Ліздзейку з-над Лідзейкі
Згадкі ў іх не будзе.

*(Суднік, С. Лідзейка з-над Лідзейкі. // Лідскі летапісец. - 2003.- №1(21).)*

ЗОРНЫ ДАР

Гэта адбылося ў тыя часы, калі бесперапынна ішлі міжусобныя войны і войскі ўзброеных вершнікаў імкнуліся заваяваць найбольш багатыя і абжытыя месцы.

Аднойчы, падчас чарговага ваеннага паходу, атрад вершнікаў вырашыў адпачыць ля невялікай рэчкі. Стаяла спякотнае надвор'е. Ваяры змарыліся ад працяглай дарогі, цяжкіх даспехаў і зброі. І, нават, калі схавалася сонца і надышла начная цемра, не кожны змог адразу заснуць.

Адзін з вершнікаў вырашыў прайсціся да рэчкі, акунуцца ў свежую вільготу. Падышоўшы да вады, воін пачуў незвычайныя гукі. Яны былі падобныя на гуканне

малога дзіцяці. Вершнік вырашыў, што гэта гукі птушак, або невялікіх жывёл каля вады. Аднак сумненне заставалася. Быццам невядомая сіла падштурхнула яго падысці бліжэй і паглядзець. У гэты час у небе над галавой з’явілася яркая зорка. Яна паказвала ваяру шлях, які вёў да чароту. І тут ззянне зоркі стала яшчэ больш яркім, а ў чароце вершнік убачыў невялікі скрутак з немаўляцем. Ад нечаканасці воін хацеў адвярнуцца і хутчэй пайсці з гэтага месца, але унутраны голас не даў яму гэта зрабіць. Вершнік узяў дзіця на рукі і адчуў такую цеплыню, што на момант забыліся і цяжкая зброя, і смерць таварышаў, а ўспомніліся родная хата, пяшчота і ласкавы позірк маці. Унутраны голас казаў, што дзіця, якое знайшоў вершнік – незвычайнае, асаблівае. Гледзячы на яго, у воіна паўставалі пытанні, навошта людзі забіваюць адзін аднога, забіраюць чужую зямлю, чаму не спыняцца і не жывуць на адным месцы, не вядуць кожны сваю гаспадарку. Вершнік узяў немаўлятка на рукі і накіраваўся ў свой лагер.

Воіны прачнуліся ад дзіцячага плачу. Большасць з іх была не задаволена тым, што не змаглі адпачыць. У хуткім часе ўсе сабраліся вакол вершніка з дзіцем і хацелі даведацца, што здарылася. У гэты час нечакана для ўсіх у небе над іх галовамі ярка засвяціла зорка. Немаўлятка перастала плакаць, а воін, які трымаў яго на руках, распачаў свой аповяд. Словы вершніка ўразілі таварышаў, яны ўспомнілі сваё ранейшае жыццё, успомнілі свае светлыя мары і надзеі…

Скрутак разгарнулі, і ўсе ўбачылі маленькую дзяўчынку, а на яе маленькай ручцы была завязана стужачка з паперкай, на якой было напісана імя – Ліда, і зроблена дапіска – дзіця зоркі, якое прынясе людзям мір і згоду.

Доўга стаяла цішыня. Зорка свяціла па-ранейшаму ярка…

Вершнік, які знайшоў дзяўчынку, прапанаваў спыніцца і жыць мірна на тым месцы, дзе быў разбіты лагер. Воіны, нібы зачараваныя, пачалі складаць зброю. Праз некаторы час былі закладзены першыя камні для будоўлі замка.

Ішлі годы. Выраслалі сцены замка, падрастала і дзяўчынка Ліда, у гонар якой воіны назвалі сваё пасяленне. У хуткім часе тут з’явіўся цэлы горад, які славіўся ўмелымі ганчарамі і іншымі рамеснымі майстрамі. А жыхары гэтага горада яшчэ доўгі час з пяшчотай успаміналі “зорную” дзяўчынку Ліду.

*(Складальнік Баравы Максім (1993 г.н.), жыхар Ліды, выпускнік СШ №1)*

**Пра Лідскі замак і яго ваколіцы**

БУДАЎНІЦТВА ЛІДСКАГА ЗАМКУ

Мясцовыя жыхары напэўна таксама ўдзельнічалі ў будаўніцтве замка і збіралі ў мясцовых лясах і на палях камяні для ўзвядзення сценаў. Паколькі справа гэта была

вельмі цяжкая, нездарма захаваўся праклён: "Каб ты на Лідскі замак каменне цягаў!" Згодна адной старой легендзе, калі ў ваколіцах амаль не засталося камянёў быў выдадзены строгі загад: не ўпускаць у Ліду ні пешага, ні коннага без камянёў. Коннаму – цэлы воз камянёў прывезці, а пешаму - хоць адзін замест пропуска здаць за брамаю варце.

Калі камянёў набраліся цэлыя горы, іх рассартавалі па памерах, па колеры і пачалі ўзводзіць сцены. На пабудову Лідскага замка людзі сабралі каменне з палёў і лясоў на 100 вёрст вакол, і той, хто задумаў паставіць печ, або закласці пад дом каменны падмурак, мусіў купляць камяні па дарагой цане, або ехаць па іх ажно пад Вільню. Пакутавалі людзі праз гэта цэлыя стагоддзі, пакуль не пачалі трэскацца і рассыпацца сцены старога замка. Вось тады і пайшла пагалоска, што кожны камень, які сарваўся з замкавай гары, каціўся да таго самага месца, з якога калісьці быў падняты... *(Дадатак 3)*

*(Запісалі падчас экскурсіі па Лідскаму замку)*

## ЯК ЛЮДЗІ ЗАМАК БУДАВАЛІ

Загадаў Князь замак будаваць, каб было дзе бараніцца, бо злы час быў. Альбо крыжакі з поўначы, альбо крымчакі з поўдня, альбо маскалі надыйдуць з ўсходу, а на захадзе - вочы галодныя ляхаў, братоў нашых заклятых.

Пазбіраліcь людзі, і вырашылі, выхваляясь, асобнымі талакамі - грамадамі будаваць.

Сяляне - асобна, паны – асобна, папы з ксяндзамі, клірыкамі - асобна.

Папы да ксяндзы выхваляліcь - мы да Бога бліжэйшыя, Бог іх паслухае, як памоляцца - будзе заслона, якой і не бачылі, а наогул - яны - першыя, без іх - нічога.

Пачалі прасіць Бога, модлы складаючы. “Дай, Госпадзе, дай, зрабі..!!!...”

Кленчаць, енчаць - а нічога не робіцца, яны яшчэ грамчэй, ужо паваліліcь ад стомы асобныя - нічога не робіцца.

І тут... Як лясне пярун з неба, і чуюць яны: “Кажа Б..г, каб ты памог!!!!”.

Усе аж на дупы свае шырачэзныя, тлустыя, і пападалі, зяпы параззявалі....

Але ж, супраць слова Б..га, нічога не зробіш, пайшлі пуза трэсьці, каменні да будоўлі несьці.

А паны, ў аксаміце, з мячамі, тай самапаламі, пазбіраліся, выхваляючысь: "Куды чорнай костке да паноў, мы ўсе асілкі-волаты, нацягнем самых вялікіх камянеў, збудуем гмах, ворагі ад жаха нават і не падыйдуць.

Знайшлі вялічэзны камень, што зіма пакінула у нашым краі (ці то асілкі калісьці ў неба кідалі). І вырашылі яго цягнуць. За гэта і выпілі, пасля пабіліся, каму загады аддаваць, кіраваць усімі, але ж ўсе на камень узбеглі з шабляю ў руцэ - кіраваць, а цягнуць - няма нікога!

Як пабіліся, пасля мір складалі, за гэта і выпілі, і зноў пабіліся, пасля тэстамент склалі аб замірэнні, гэта і адзначылі, колькі ўсе цягнулась – невядома, але ж, і пітво і ежа ў іх скончылась.

Вырашылі разыйціся, назапасіць ўсяго і вяртацца, бо яны, паньства, разам сіла і моц, кроў старажытная і косткі асабістыя.

Разыйшліся, знайшлі, дзе яшчэ быдла ды збажэння няз'едзенна, нарабавалі, мячамі махаючы на усіх... І засталісь, кожны ў асобным месцы, бо з другімі панамі падзяліцца - абраза гонару, дый - шкада.

А камень той і застаўся, вялікі такі, з гумно памерамі, побач з Віленскім шляхам.

А людзі звычайныя: сяляне, майстры цягнуць... хто камень з галаву - сам двое, хто на колах - з кабана галаву камень вязе, а хто кіямі штурхае -памерамі з чалавека.

Бабы яйкі прынясуць, майстрам ў пачастунак і ў вапну, каб мацней была.

Сабе жа будуюць. Усе працуюць.

Жанчыны ежу гатуюць, малыя жвір сеюць, гліну месяць, так грамадой, з клірыкамі і збудавалі.

А тут Князь з выправы вяртаецца.паглядзеў, як людзі з святарамі заслону сабе збудавалі, запытаў – "А дзе паны?", спахмурнеў, адказ атрымаўшы - няма іх...

І загадаў прывілей выдаць.

У гародне царкву збудаваць, людзям ў час набега за агароджай хавацца, а панам, якія не працавалі, бараніць ўсіх, бо ўзялі зброю ў рукі. А каторыя бараніць ня будзе ў твердзь не нагой.

Вось так і сталася, паны павінны людзей і Царкву бараніць, а калі яны (паны) гэтага не робяць - ў шыю, прэч іх.

*(Захаваны аўтарскі тэкст. Шаўчэнка, М.Б. "Пляснуўся з неба Цмок…" - Онікс, 2010.)*

## ДЗВЕ САСНЫ

Амаль да самага пачатку Вялікай Айчыннай вайны  каля адной са сцен Лідскага замка раслі дзве старыя сасны. З мясцовых жыхароў ніхто не ведаў колькі гадоў, а можа нават стагоддзяў назад яны там з'явіліся. Але з пакалення ў пакаленне перадавалася наступная лягенда аб іх.

Дзве княжны Лідскага замка былі заваражаны калдуном і пераўтвораны ў дзве сасны. Гэтыя чары можна было зняць толькі адслужыўшы ў касцёле службу ў пэўны дзень і  ў пэўны час, пры пэўным рытуале. Тайны чараў ведаў толькі адзін ксёндз. Але як толькі ён падыходзіў да алтара, каб зняць гэтыя чары, то аказвалася, што для правядзення службы не хапае атрыбутаў. Але якіх, так і не ўдавалася высветліць. Служба так і не адбылася і чары не былі зняты.

Быў час, калі людзі, якія не ведалі гісторыі пра дзве сасны, спрабавалі іх спілаваць. Але пры надрэзе з іх прасочвалася вадкасць чырвонага колеру, якая нагадвала кроў. Гэта і палохала людзей, таму і век у сосен быў такі доўгі.

Хадзілі чуткі аб тым, што калі сосны спілаваць, то пачнецца вайна. У 1941 г. чыясці нядобрая рука на гэта адважылася. *(Дадатак 4)*

*(Запісалі ад Конана Генадзя Пятровіча, намесніка дырэктара турыстычнай фірмы "Святавіт")*

## СОСНЫ ЛЯ ЛІДСКАГА ЗАМКА

На схіле ўзгорка, нібы падпіраючы замак, раслі дзве даўгалетнія сасны. Яны захаваліся дзякуючы пашыранаму сярод гараджан і навакольных жыхароў перакананню, што яны выраслі не на раслінным соку, а на крыві. Здарылася гэта быццам яшчэ ў часы, калі ў Літве панавала язычніцтва. Прыйшлі сюды дзевяць манахаў-францысканцаў прапаведаваць хрысціянскую рэлігію. Аднак ліцвіны, не жадаючы прымаць хрысціянства, забілі гэтых місіянераў, а іх трупы ўкінулі ў яму на схіле Лідскага замка. На гэтым месцы, не сеяныя і не саджаныя, выраслі дзве сасны, якіх ліцвіны, ужо стаўшы каталікамі, нечапалі. Але вось аднойчы хтосьці адсёк галінку і з яе выступіла кроў. З той пары ніхто ўжо, не адважваўся ўзняць сякеру на гэтыя дрэвы... *(Дадатак 5)*

Аднак сёння тых соснаў няма.

*(Лідчына // Наша слова. – 2006. - 19 ліпеня;*

*Легенды і паданні / [Склад. М.Я.Грынблат і А.І.Гурскі; рэд. Тома А.С.Фядосік]. – 2-е выд., дап. і дапрац. – Мн.: Бел. навука, 2005. С.355)*

## О ЛИДСКОМЪ ЗАМКѢ

Причиной постройки этого замка, по разсказамъ стариковъ, было слѢдующее обстоятельство: Одинъ изъ Литовскихъ Князей женился на Польской плеѢнницѢ, и до того её любилъ, что, въ память ея построилъ замокъ и назвалъ по имени ея "Боною."

Выписавъ работниковъ, изъ НѢмецкой земли, Князь велѢлъ производиь постройку. По окончанiи - постройки замка Князь отдалъ всё своё богатство (войско, пушки) своей любимой женѢ и на всегда велѢлъ ей оставаться въ замкѢ. Самъ онъ вскоромъ времени скончался, а за Княземъ скончались и мастера, строившiе замокъ. Еще передъ смертiю онъ приказалъ женѢ своей похоронить его вмѢстѢ съ мастерами въ замкѢ , а въ противномъ случаѢ, говорилъ Князь, ее вѢчно будетъ мучить дьяволъ. ВсѢ приказанiя своего мужа Княгиня обѢщала исполнить при жизни Князя; но какъ только онъ умеръ, многiе Литовскiе и Польскiе Князья прiѢхали въ замокъ и просили ея руки; Княгиня забыла обѢщанiе мужу; велѢла тело его занести за замокъ и похоронить тамъ. Не успѢли Князя занести въ назначенное мѢсто, какъ жена его, Бона, исчезла. По преданiю она провалилась сквозь землю "въ пекло" (въ адъ). Много прошло времени послѢ этого, видѢлъ ее во снѢ одинъ Дьячекъ, у котораго она просила спасти ее, но всѢ попытки спасти Княгиню не удались. Говорятъ еще, что она каждый годъ на первый день Пасхи освобождается отъ мученiя и выходитъ поплакать на Божiй свѢтъ, стережетъ ее яко бы черная собака. На том мѢстѢ, где похороненъ Князь, выросли, какъ говорятъ, три сосны: одну изъ нихъ кто-то срубилъ, и въ скоромъ времени умеръ; отъ того пошла молва, что нельзя рубить этихъ сосенъ: скоро, молъ, умрешь.

*(Захаваны аўтарскі тэкст. Крачковский, Ю.Ф. Быт западно-русского селянина // Чтения в О-ве истории и древностей российских при Московском университете. 1873. К.4. М., 1874. С.210)*

## КАРАЛЕЎСКІ ЎЕЗД Ў ЛІДСКІ ЗАМАК

У лютым 1422 года ў Лідскім замку шырока і бліскуча адзначаўся шлюб прастарэлага 71-гадовага караля Ягайлы з маладзенькаю 17-гадовай Соф'яй Гальшанскай. Справа ў тым, што для Ягайлы гэта быў чацвёрты шлюб, першыя яго тры жонкі памерлі, так і не заставіўшы наследніка. Соф'я ж нарадзіла Ягайлу дзвух сыноў – Уладзіслава, Казіміра і стала заснавальніцай дынастыі Ягелонаў. Шлюб паміж Ягайлам і Соф'яй быў заключаны ў Навагрудскім фарным касцёле, а затым маладыя прыехалі ў Ліду. Вясёлыя баляванні працягваліся да вялікага паста. Магчыма і першая шлюбная ноч была праведзена ў пакоях Лідскага замка.

Згодна паданню, у замку загаддзя рыхтаваліся да сустрэчы маладых. Узімку 1422 г. у тэрміновым парадку быў прабіты каралеўскі ўезд ва ўсходняй сцяне. Да каралеўскага праезду павінны былі мост пабудаваць, але пры археалагічных раскопках

рэшткаў паль не знайшлі. Мабыць быў збудаваны пантонны мост, хоць Вітаўт быў "гаразд" на цуды, мог і ледзяны зрабіць. *(Дадатак 6)*

*(Сліўкін, В. Будаўніцтва Лідскага замка і ўладкаванне прылеглай тэрыторыі (14 – 15 стагоддзі) // Лідскі летапісец. – 2006. - № 4 (36).*

*Лідчына // Наша слова. – 2006. - 19 ліпеня.)*

## ПРЫВІДЫ ЛІДСКАГА ЗАМКА

Сказанне гаворыць пра тое, што шмат стагоддзяў таму назад ворагі напалі на Лідскі замак. Шмат іх было. Спалохаўся князь, адчыніў ноччу сакрэтную брамку і ўцёк са сваім войскам. А на сценах, каб абхітрыць ворага, пакінуў трошкі ахоўнікаў. На смерць іх пакінуў. Раніцай ворагі ўбачылі адчыненую браму, і, як гончыя, кінуліся да яе, стукаючы ад радасці зброяй у шчыты. А латнікі збеглі са сцен, засланяючы мячамі ды шчытамі шлях у замак. Так распачаўся смяротны бой. Уся ахова палегла каля брамы, але ў замак, дзе знаходзіліся жыхары горада, так вораг і не трапіў. І вось з таго часу, калі ля замка чуецца звон зброі, можна ўбачыць на яго сценах цені загінуўшых латнікаў, што спяшаюцца абараніць і свой горад, і сваю зямлю. *(Дадатак 7)*

*(Черноус, Т. В Лидском замке ... привидение? // Лідская газета. – 2007. - 24 сакавіка.)*

## ТАХТАМЫШАЎ СКАРБ

Дакладна вядома, што з 1396 па 1399 год жыў у Лідзе татарскі хан Тахтамыш. “Тахтамышаў двор” знаходзіўся на беразе Лідзейкі, там, дзе цяпер аўтастаянка за гасцініцай “Ліда”. Аб яго прыбыванні ў нашым горадзе захавалася наступнае паданне.

Тахтамыш, якога перамог Цімур, знайшоў прытулак у Вялікім княстве Літоўскім. Разам са сваёй вялікай світай і з мноствам багаццяў, хан пасяліўся ў Лідзе. Кажуць, што сюды ён прывёз толькі золата - 30 падвод. Захоўваць такое багацце на падводах ці ў юрце было небяспечна, таму Тахтамыш загадаў свайму даверанаму чалавеку закапаць золата ў зямлю дзе-небудзь ў надзейным месцы.

У 1399 годзе князь Вітаўт на чале 70-тысячнага войска і татарскія войскі пад камандаваннем хана Тахтамыша пацярпелі паражэнне на рацэ Ворскле. Тахтамыш, чуючы няладнае, першы ўцёк з поля бою.

А дзе ж той давераны чалавек, які закапаў ханскія багацці ў лідскай зямельцы? Ён злажыў сваю галаву на беразе Ворсклы.

Дзе ж цяпер шукаць Тахтамышу свой скарб? Слядоў не засталося. Так з тых самых часоў і ляжыць золата дзесьці на Лідскай зямлі. *(Дадатак 8)*

*(Запісалі ад Каладзяжнай Анастасіі Аляксандраўны, супрацоўніцы гісторыка-мастацкага музея)*

**Пра гістарычныя падзеі і гістарычных дзеячаў**

ЧАМУ НА ЛІДСКІМ ГЕРБЕ ЛЕЎ?

У 1410 годзе лідская харугва начале з лідскім старастам, хутчэй за ўсё гэта Якуб з Селіцы, брала ўдзел у Грунвальдскай бітве і ўся там палегла. Існуе мясцовая лягенда, што менавіта за гэты вычын Лідскай харугвы пазней на герб горада быў дадзены леў - сімвал адвагі і сілы.

*(Лідчына // Наша слова. – 2006. - 19 ліпеня.)*

- Пан вяльможны, за Грунвальда ззянне,

Дзе, як леў, лідзянін кожны біўся да сканання,

Леў павінен быць на гербе ў слаўным месце Лідзе,

І ніколі горад гэты мужнасць не абыдзе. *(Дадатак 9)*

*(Суднік, С. Панегірык на герб горада Ліды // Лідскі летапісец. – 2006. - № 4.)*

БЫЛО ГЭТА Ў ЧАСЫ...

Было гэта ў часы, калі Літа-Ліда была драўляным местам на высокім беразе.

Прыйшлі на зямлю нашу ворагі-татары, якія ўжо абрабавалі ўвесь поўдзень Русі.

Ішлі яны, татары, да горада галоўнага крыжакаў на поўнач. Цягнулі за сабой нарабаванае: тры воза золата, тры серабра, тры скарбаў: каменняў, тры павалок. У крыжакаў спадзяваліся яшчэ па возу ўзяць ўсяго.

На шляху да войска, што было ўжо за два перахода ад Ліды, ў бару-дубраве старажытнай выпаўз насустрач змей незвычайны, крокаў мо ў дзесяць даўжыню, чалавека таўшчынёй, і вочы ў яго чалавечыя, на галаве ў яго - княжая шапка з каронай.

Выпаўз, ісці наперад замінае, глядзіць кожнаму ў вочы – бо чароўны погляд ў яго.

Вецер ў твары ваярам дзьмухнуў ажно некаторыя пападалі.

Хан татар - Шайбак крычыць, наперад гоніць, а коні не ідуць. Загадаў з лукаў забіць пачвару, стрэлаў гару насыпалі - ніводная не патрапіла.

Зьмей засьмяяўся і знік, войска наперад, а тут з лесу, з травы зьмеі з'явілісь, коні скочуць, падаюць, людзі шалеюць, коні ад людзей пабеглі, людзі за німі, а з леса ваўкі зграямі, аднаго-другога схопяць, уцягнуць, трох чатырох пашматкаюць і... знікаюць. І так увесь дзень і вечар. І ноч да раніцы. А раніцай на ўсходзе пад крыжом Ярылы-Святавіта людзі з лесу пайшлі і пачалі забіваць. З крывавага кола адзін з дзесяці

татаріна выскачыў, у каго коні лепшыя, разам з Шайбак Ханам. Па сьцежкам ратуюцца...

А людзі - люты, перакінуліць ў ваўкоў і за імі, але, чамусьці не кранаюць. Зразумеў Хан Шайбак ў пастку гоняць... Але што рабіць, сьмерць - вось яна... на хвасце, а што наперадзе - невядома.

Але ж сталі тут коні татарскія, бо Вуж-Аз з'явіўся ў атачэнні пошта сьвістуноў.

Хан вішчыць: “Забейце!!”... а людзі - як і коні ў слупы пераутварыліся... Пацэліў Шайбак, стрэліў з лука, але страла вакол Вужа аблецела і ў вока Шайбака пацэліла. І памёр хан, сканаў як звер, бо як звер па зямлі скочыў, гарады і народ рэзаў...

І ціха ў лесе...

Заварушыліся, агледзеліся, а цела Шайбакова не пахаваць – знікла - і скарбы зьніклі.

Пакінулі на месцы, дзе загінуў Хан камень са знакамі і рушылі на поўдзень. А пад Лідай ізноў вужа Аза сустрэлі, ды забітага хана перад ім. І голас пачулі: “Пахавайце і заставайцесь, будзеце шкоду адрабляць, хто не застанецца – пашкадуе”.

Пахавалі.... і засталісь.

І баранілі зямлю, на якой працавалі, Літву - айчызну. Добрыя, чыстыя, працавітыя людзі. А ваяры якія мужныя, пашукаць такіх, амаль не знойдзеш.

А скарбы - і золата, і срэбра, і каменні зніклі.

Кажуць, вуж схаваў, каб кроў з іх спрахнела.

А калі не будзе крыві на іх, то Ліцьвіны іх і знойдуць, калі для Края спатрэбіцца.

А калі сабе шукаць - не знойдзеш...

Калі пашанцуе. А калі не... з Азам сустрэнешся.

*(Захаваны аўтарскі тэкст. Шаўчэнка, М.Б. “Пляснуўся з неба Цмок…” - Онікс, 2010.)*

## ВУЛІЦА ЛЕГЕНДАРНАЙ ГРАЖЫНЫ

Імя легендарнай Гражыны насіла адна з вуліц нашага горада з 1921 па 1939 год.

Згодна паданню Гражына — княгіня, жонка Навагрудскага князя Літавора. Даведаўшыся, што праз Навагрудак рухаецца ў бок Ліды вялікі атрад крыжакоў, стала прасіць мужа, каб ён сабраў сваю рыцарскую дружыну і перашкодзіў гэтаму паходу ворагаў. Не ведала княгіня, што Літавор уступіў у змову з крыжакамі і за тое, што яны не закрануць у гэтым паходзе Навагрудак і ягоных жыхароў, даў слова прапусціць іх міма без якіх-небудзь перашкод, пакідаючы тым часам без дапамогі Лідскі замак. Ніякія ўгаворы, маленне Гражыны не дапамаглі. Князь застаўся няўмалімы.

Ноччу, калі ён спаў, Гражына, апрануўшы княжацкія даспехі, тайком выводзіць дружыну рыцараў на бой з крыжакамі. Яна аказваецца ў самых гарачых месцах схваткі. Сваім прыкладам адважная княгіня вядзе за сабою рыцарскую дружыну. Усе захапляюцца мужнасцю і маладзецтвам невядомага воіна.

Вораг разгромлены. Але смяротна паранена Гражына, і ад ран яна памірае. І толькі тады ўсе ўбачылі, што пад княжацкім адзеннем была схавана жанчына — жонка князя – Гражына. Усё атачэнне было здзіўлена і ўражана.

Па існаваўшаму ў тыя часы звычаю цела Гражыны перадалі агню.

Дзякуючы гераічнаму ўчынку Гражыны крыжакі да Ліды не дайшлі. У памяць аб гэтай падзеі ўдзячныя лідчане назвалі былы Навагрудскі тракт вуліцай імя Гражыны. Пасля далучэння ў верасні 1939 года Заходняй Беларусі да БССР і да сённяшняга дня гэта вуліца Энгельса.

*(Вуліца легендарнай Гражыны // Лідская газета. 2005. - 14 мая.)*

## "І БУДЗЕ ІГРАЦЬ МУЗЫКА НА МОГІЛКАХ НЕМАЎЛЯТ ..."

На тым месцы, дзе сёння знаходзіцца Лідскае музычнае вучылішча, калісьці стаяў жаночы манастыр. Многія манашкі грашылі, а маленькіх дзяцей – плод свайго граха, яны закопвалі каля сценаў манастыра. Аднойчы адзін са святароў, які праязджаў каля гэтай пабудовы, сказаў: "... і будзе іграць музыка на могілках немаўлят ...". Ці то праўдзівы гэты апавяд, ці то не, аднак музыка тут сапраўды іграе. *(Дадатак 10)*

*(Будревич, В. Исторические тайны. Легенды о родном крае. // Оникс. - 1998. - № 4.)*

## ЯК ЯЎРЭІ ПЕРАЙШЛІ Ў ПРАВАСЛАЎЕ

Слабада сёння займае паўднёва-заходнюю частку горада. Раней гэта была вёска, якую называлі Дварцовай Слабадой. Называлі яе так, таму што ўсе землі вёскі разам з жыхарамі належалі каралеўскаму двару ў асобе намесніка караля ў Лідзе.

Прыблізна каля 1860 года была прынята пастанова заснаваць паселішча на землях Дварцовай Слабады. Мясцовыя ўлады пэўна не мелі дакладных указанняў, каго пасяляць на новым месцы. Спачатку пачалі пасяляць яўрэяў. Адразу пасяліліся там чатыры яўрэйскія сям'і: дзве па прозвішчы Ліпніцкія, трэцяя - Баруховіч. На жаль, прозвішча чацвёртай засталося невядомым.

Праз некаторы час, калі стала вядома аб гэтым у Пецярбургу, адтуль паступіла рашучая забарона, і было загадана пасяляць толькі сем'і праваслаўных. Паўстала пытанне, што рабіць з тымі яўрэямі, якія пасяліліся тут раней і паспелі ўжо абжыцца:

абзавесціся сядзібай, жывёлай, рознымі забудовамі і прыналежнасцямі. Вырашыць гэтую праблему магчыма было толькі высяленнем іх з абжытых месц. Але ніхто перасяляцца не пажадаў. Асвоеныя і апрацаваныя па 20 гектараў ворнай зямлі, якія яны атрымалі ў надзел, таксама мелі сваю высокую вартасць. Таму яўрэі рашыліся надалёка ідучы кампраміс: перайсці з іудзейства ў хрысціянства і прыняць праваслаўную веру. Пасля хрышчэння і перапісу да царквы Ліпніцкія прынялі прозвішча Ліпінскіх, Баруховічы сталі Барысевічамі, а чацвёртая сям'я - Кржыжаноўскімі.

*(Кулеш, А. Горад Ліда: гістарычныя крокі развіцця // Гродзенская праўда. – 2000. - 24 кастрычніка.)*

**Пра узнікненне і паходжанне назвы рэк, азёраў, крыніц**

ЖЫВАТВОРНАЯ КРЫНІЦА

Жыла калісьці за сценамі Лідскага замка прыгажуня дзяўчына. Завітаў аднойчы ў свой замак князь Гедзімін. Убачыў дзяўчыну і закахаўся ў яе. Ніштo здавалася не магло перашкодзіць іх шчасцю.

Але зноў пачалася вайна. Узяў князь меч і баявыя даспехі і павёў сваё войска на ворага. Ваявалі доўга. Цэлых 17 гадоў. Але не забыў ён сваю прыгажуню-паннаачку. І яна таксама засталася верная клятве. Усе семнадцаць гадоў чакала толькі яго.

І нарэшце настаў дзень. І гучна заспявалі трубы. І ў двор Лідскага замка ўехаў на баявым кані праслаўлены воін - князь Гедзімін. Насустрач яму выйшла незнаёмая сівая жанчына і нізка пакланілася. Аслупянеў князь. Адступіў назад. “Заходзь, гэта ж я – твая нявеста” – паклікала яго жанчына. Не зрабіў князь ні кроку. А паннaчка падбегла да акна і кінулася галавой уніз. Апамятавайся князь, сарваў з сябе меч, пабег уніз па лесвіцах, укленчыў на двары над распрасцёртай паннaчкай. І раптам убачыў, што ляжыць перад ім усё тая ж маладая, прыгожая дзяўчына.

Доўга сумаваў Гедымін. Часта яму бачылася паннaчка ў сне.

Пасярэдзіне замчышча калісьці быў калодзеж. Даўно ўжо ніхто ў гэтага калодзежа не браў вады і засыпалі яго пяском, ды завалілі валунамі. Мовілі быццам вада там сапсавалася. Але ў тую ж ноч з'явілася князю ў сне паннaчка. Быццам ўселася яна ў нагах і прасіла раскапаць стары калодзеж, кажучы князю, што было ў яе адзінае акенца, праз якое яна на волю, на сіняе неба глядзела, а цяпер закрылі яго, засыпалі ёй вочы пяском. Так увесь дзень князь раскопваў, выцягваў са старога калодзежа смецце ды каменне, а праз ноч зазвінела, заспявала па крынічных каменнях чыстая, празрыстая, як сляза вадзіца.

*(Запісана з відэафільма “Жыватворная крыніца”, тэлеканал БТ)*

## РАКА ЛІДЗЕЙКА

У замку разам са сваім бацькам жыла князёўна Ліда. Дзяўчына моцна закахалася ў простага селяніна. Прыгожы юнак таксама адказаў ёй ўзаемнасцю. Калі бацька Ліды даведаўся аб іх каханні, ён тут жа загадаў расправіцца з хлопцам. Аднак, на шчасце маладых, ім удалося збегчы з замка. Князь яшчэ больш разлаваўся і загадаў сваёй варце схапіць і забіць абодвух. Закаханыя доўга беглі і праз некаторы час стаміліся. Вырашылі адпачыць і прыселі на беразе рэчкі. Аднак праз некаторы час іх напаткалі прыспешнікі князя. Яны забілі юнака, а Ліда сама з гора кінулася ў раку і патанула. З таго часу раку і пачалі называць Лідзейкай у гонар князёўны, якая засталася вернай свайму каханню. *(Дадатак 11)*

*(Запісалі ад Лаўкель Пятра Юзэфавіча (1974 г.н.), жыхара Ліды, супрацоўніка МЧС)*

## АСІЛКІ

Было гэта ў часы, калі сярод людзей жылі волаты, якія баранілі край наш, разам са слугамі збройнымі на быстрых канях з суліцамі...

Баранілі асілкі дубы сьвятыя, да звычаі Рода. І ніхто не прыбегаў сюды рабаваць. Ні Ледзяне, ні Ўрмане, бо ведалі моц волатаў. І быў князем тады Скаманд.

Сквапны і жорсткі. Прамовіў ён да людзей – “Няма ворагаў, няма вайны, а сколькі ежы на волатаў выдаткуеце. А колькі скуры на абутак, на адзенне... А піва та, піва колькі выпіваюць?! А я - вас у тры разы танней бараніць буду.” Падумалі людзі, і пагадзілісь. Дурныя, бо.

Пайшлі да волатаў і кажуць - не патрэбны - ідзіце прэч. Тяжка ўздыхнулі асілкі, абразілісь...

Але любілі Край і людзей, болей за ўсяго. І вырашылі. Сыходзіць - не будуць. А зробяць - хто ў дубы перакінецца, хто, віпіўшы сонны зелак - паляжа спаць... і наказалі - калі патрэба якая будзе-то будуць словамі моцнымі і травой - кветачкой росной. Словы князю Скаманту і ваярам яго пакінулі.

І паснулі. Вецер пылам-зямлей прысыпае, лісьцце - хвой завее. Курганы ўтварылісь, некаторыя мо ў 40 крокаў. Сьпяць, чакаюць, што паклічуць Край бараніць.

А словы і зелкі Скамант схаваў ў нетрах возера патаемнага.

Прайшоў час, пачаў збіраць з плуга сам-тры, болей за Волатаў.

Сквапны. Бессаромны.

А маці Скаманта плакала, гледзячы на брыдоты сына, шкадавала, ад слёз утварылась рэчка, што пабегла да горада, які на плесе быў. А на сэрцы камень вялікі стварыўся ў яе...

Плакала маці, аж да скона сына свайго, а, як той сканаў, сама ў вырай адыйшла, а камень з душы пляснуўся, пабіўся, аскепкі аж да Лідзейкі, на бераг перад горадам вынесла. І назвалі людзі рэчку Скаманкай, а з часам, калі запамяталі аб Скаманте, па вялікім каменням (якое дзіва на дрыгве) - Каменкай.

А каменні тыя адны кажуць - дрыгвай засмактала, другія - Лідзейка, кроўны Гедземіна на замак аднёс.

*(Захаваны аўтарскі тэкст. Шаўчэнка, М.Б. "Пляснуўся з неба Цмок..." - Онікс, 2010.)*

ЛІДСКАЕ ВОЗЕРА

На месцы Лідскага возера калісьці былі яўрэйскія могілкі, праз якія ішла дарога. Перад запаўненнем возера рэшткі людзей дазволілі перазахаваць. Але не ва ўсіх, якія ляжалі ў зямле, засталіся родныя. Таму многія так і засталіся ляжаць там, дзе іх пахавалі. Калі запаўнялі возера, на яго паверхню ўсплывалі косткі, саваны, розныя прадметы. А дарога тая так і засталася пад вадой.

Магчыма, па гэтай прычыне ў Лідскім возеры так часта топяцца людзі. Многія жыхары горада, якія ведалі возера да таго часу як яго спусцілі, помняць тое месца, якое так і называлася – старая дарога. Менавіта па гэтай паласе, якая ішла ад гаражэй да завода "Лідсельмаш", возера можна было перайсці ўброд.

*(Будревич, В. Исторические тайны. Легенды о родном крае. // Оникс.- 1998. - № 4.)*

**Пра сацыяльныя адносіны**

ЗАКАСАНКА

На паўночнай ускраіне Віленскай вуліцы (цяпер вуліца Савецкая), прыкладна там, дзе сёння раскінуўся завод "Лідсельмаш", знаходзілася карчма нейкага Айзіка Закса. Пастаянныя наведвальнікі празвалі гэтую карчму "Закасанкай". А калі пабудовы пашырыліся далей за чыгунку, створаную цэлую дзяльніцу таксама сталі называць "Закасанкай". Старажылы расказвалі амаль анекдатычную гісторыю, якая адбывалася ў карчме. Паклоннікі Бахуса прыходзілі ў карчму, сядалі за стол, налівалі кожны сабе па чарцы і чакалі, на чыю чарку сядзе першай муха. Гаспадар чаркі пасля гэтага выпіваў

усе астатнія дарма, і ўсё паўтаралася спачатку. Таму і гульню сталі называць "мушкай".

Ёсць і іншая версія паходжання назвы "Закасанка". Быццам тут пасля дажджоў, вясной і восенню, было вельмі гразка. Навокал стаялі лужыны, і прайсці праз іх у абутку, ды не закасаўшы порткі, было немагчыма. Быццам адсюль і назва такая, "Закасанка". *(Дадатак 12)*

*(Кулеш, А. Горад Ліда: гістарычныя крокі развіцця // Гродзенская праўда. 2000. - 24 кастрычніка.)*

СЛАБАСЦІ ЗАРАЧАНЦАЎ

Сучасная вуліца Калініна і прылеглыя да яе вуліцы і завулкі называліся калісьці Зарэччам. Самае цікавае тое, што зарачанцы трох пакаленняў мелі славу забіяк і авантурыстаў. Якія падзеі адбываліся ў свеце, іх не цікавіла. Ім здавалася, што на Зарэччы лепш за ўсё, яны па-свойму, адчувалі сябе шчаслівымі. І вось па якой прычыне. На горачцы пры дарозе стаяла зарачанская карчма. У ёй заўсёды было шматлюдна і весела. У свята збіраліся сяляне з навакольных вёсак, па нядзелях заязджалі пасля касцёла больш далёкія вяскоўцы. Карчмар Арон прымаў усё: грошы, збожжа, палатно, хто што даваў. А два сыны Арона, не шкадуючы сіл, ладзілі танцы. Адзін граў на скрыпцы, другі — на цымбалах, часцяком запрашалі баяніста, і атрымоўвалася весела. Ног утрымаць было немагчыма. Змей п'янства трымаў у Зарэччы ў абдымках усіх, нават жанчын. З меркай збожжа на плячах або кавалкам палатна пад фартухом, па вечарах краліся яны за кустамі цераз луг у карчму. Так балявалі б доўга яшчэ, але зарачанскую карчму спаліў адзін з сялян, прыраўнаваўшы жонку.

*(Мацеша, В. Забытыя згалоскі гарадскога радаводу // Лідская газета. – 2005. - 13 верасня.)*

**Заагенічныя легенды і паданні**

ЧАМУ САБАКА НЕ ЛЮБІЦЬ КАТА, А КОТ НЕ ЛЮБІЦЬ МЫШЭЙ

Аднойчы гаспадар даверыў свайму сабаку сцерагчы важныя дакументы. Аднак кот іх выкраў і закапаў у зямлю. А мышы гэтыя дакументы знайшлі і з'елі. З таго часу і пайшло, што сабака не любіць ката, а кот не любіць мышэй.

*(Запісалі ад Мацiяс Юзэфы Юзэфаўны (1923 г.н.), жыхаркі Ліды)*

ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ ЛІДСКАГА РАЁНА

## Пра паходжанне і назвы вёсак, мясцін

### БЕЛІЦА

Вельмі даўно жыў у нашым краі багаты пан, і была ў яго дачка-прыгажуня Белітэ. Калі яна вырасла, бацька пачаў шукаць для яе багатага і знатнага жаніха. Але Белітэ пакахала мясцовага юнака, каваля Златарэчку. Каханне было такім чыстым і моцным, што, здавалася, нішто не зможа іх разлучыць. Пан, нарэшце, знайшоў для дачкі жаніха, было прызначана вяселле. Як ні ўпрошвала Белітэ бацьку не разлучаць яе з мілым, ён быў няўмольным. У дзень вяселля з роспачы Белітэ рашыла лепш памерці, чым выйсці замуж за нялюбага. Яна прыбегла на бераг Нёмана і кінулася ў яго хвалі. Калі слугі, пасланыя панам у пагоню, прыбеглі да ракі, то ўбачылі кругі над цёмнай вадой і хусцінку Белітэ. Раптам сцямнела, пачалася вялікая бура. Неба прарэзалі маланкі і паліў лівень, які не пераставаў ісці тры дні і тры ночы: так прырода аплаквала гэтае трагічнае каханне.

Пачуўшы пра смерць Белітэ, Златарэчка, як звар’яцелы, з ранку да вечара, з году ў год, да самае смерці хадзіў па беразе Нёмана і клікаў сваю каханую: “Белітэ..., Белітэ..., Белітэ...”. З цягам часу людзі пачалі называць і паселішча - Беліца. *(Дадатак 13)*

*(Запісалі падчас экскурсіі ў краязнаўчым музеі Беліцкай сярэдняй школы)*

### БЯРОЗАЎКА

Некалі нашы продкі пакланяліся паганскім багам. Многа іх было, і буйных, і дробных, адным словам - на ўсе выпадкі жыцця. Чалавек выбіраўся ў лес - маліўся таму Богу, які апекаваў над лесам і ляснымі звярамі, каб добра ўсё ў гэты дзень атрымалася, каб не было ніякіх ліхіх здарэнняў. Выпраўляўся на рыбалку - адпаведна маліўся Богу вады, каб той ненарокам не раззлаваўся і не забраў яго ў падводнае царства. Так і жылі, так і пакланяліся. Колькі стагоддзяў - цяжка сказаць. Відаць, многа, бо людзі тут надта даўно аселі. Але прыспелі новыя часы, і паўсюдна сталі ўводзіць новую веру - хрысціянскую.

Спачатку толькі багатыя яе прынялі. Першым князь са сваёй сям'ёй стаў праваслаўным, затым яго прыбліжаныя пачалі новаму Богу маліцца, а ўжо потым сталі астатніх прымушаць у цэрквы ды ў храмы хадзіць, на каленях стаяць і Усявышняму паклоны адбіваць. Плакалі людзі, не хацелі цурацца сваіх ідалаў, якім і іхнія прадзеды ахвяры прыносілі, але што зробіш... Некаторыя забіралі сем'і і, захапіўшы толькі самае неабходнае, уцякалі ў глухія мясціны, каб там жыць па старадаўніх законах. Ды толькі нядоўга такое працягвалася, бо прапаведнікі хрысціянства і там іх знаходзілі.

Недалёка ад мясціны, дзе зараз наша паселішча, стаяў вялікі палац, і жыў у ім вяльможны княжацкі ваявода, які хоць і залежаў ад тутэйшага валадара, але ўсё роўна сябе ставіў вышэй. Многіх бедных ён са свету звёў толькі з-за таго, што крыжык на шыі не насілі. Як ні малілі, як ні прасілі яго людзі, што няма за што купіць, няма чым заплаціць кавалю, ваявода і чуць нічога не жадаў. Усе вёскі і хутаркі, нават самыя маленькія, былі ахрышчаны, дзякуючы намаганням гэтага злога чалавека. Радаваўся ён і пры выпадку казаў князю:

- У мяне ўсе праваслаўныя, у мяне, княжа, паганцаў няма.

Хваліў валадар адданага служку, у прыклад іншым ставіў. Але аднаго разу закавыка атрымалася. Прыляцеў вершнік на ваяводскі двор і, не злазячы з каня, крыкнуў служкам:

- Дзе гаспадар?

- Адпачывае, а што? - запыталіся тыя.

- Будзіце хутчэй, бо справа дужа неадкладная. Пабаяліся тыя марудзіць і паджгалі да ваяводы.

- Ваявода-бацюхна, уставай, там пасланец да цябе.

- Які пасланец у такую рань? Ідзіце, пакуль бізуном не адхадзіў. Паспаць з-за вас спакойна нельга.

Але тыя не адыходзілі, зноў і зноў катурхалі свайго валадара:

- Ваявода... Ваявода... Пасланец... Сцвярджае, што справа вельмі важная. Трэба ўставаць.

Той вымушаны быў устаць:

- Вядзіце яго да мяне.

Калі пасланец паўстаў перад сонным ваяводам, то той сярдзіта прамовіў:

- Што табе гэтак ужо карціць, калі не мог патрываць пару гадзін?

Пасланец бохнуўся на калені:

- Ваявода, не карай. Не мог я трываць, бо знайшлі мы адно паселішча, дзе яшчэ ёсць чалавек, які прытрымліваецца паганскае веры...

- Дзе гэта вы знайшлі такое?

- Ды зусім побач, амаль што ля твайго замка.

- Быць такога не можа. Я ж тут усюды пабываў.

- І я б не паверыў, каб на свае вочы не ўбачыў. Там нашыя людзі засталіся вартаваць, а мяне дзесяцкі паслаў тэрмінова паведаміць пра навіну.

- А вы таго злыдня да мяне не прывалаклі?

- Мы паспрабавалі было, але мясцовыя жыхары кінуліся на яго абарону, мы і пабаяліся.

- Што, узброеныя воі пабаяліся сялян? Ты гэта мне хочаш сказаць?!

Ваявода не на жарт вызверыўся, а пасланец адразу паспрабаваў перавесці гаворку ў іншы бок.

- Мясцовыя жыхары аднагалосна сцвярджалі, што ён не заклікаў іх пакланяцца старым багам, а толькі дапамагаў лячыцца ад усялякіх хвароб. Таму дзесяцкі і паслаў мяне, каб я ўсё распавёў табе і прывёз адказ, як дзейнічаць далей.

- А ніяк не дзейнічаць! - узарваўся гаспадар. - Едзь назад, і каб да палудня той вяшчун быў у мяне. Калі не даставіце, то сваёй шкурай заплаціце, так і перадай свайму дзесяцкаму!

Ваявода пайшоў дасыпаць, а пераляканы вершнік ускочыў на каня і паімчаў назад.

Пад полудзень звязанага вешчуна скінулі з каня прама перад палацам ваяводы. Гаспадар стаяў на ганку і, здавалася, спаў, але на самай справе, як толькі таго чалавека скінулі долу, ён адразу запытаўся:

- Ну, што скажаш?

- А нічога... - спакойна прамовіў вяшчун, падымаючыся на ногі. - Што я павінен гаварыць?

- Чаму ты не прыняў хрысціянскае веры?

- Я пакланяюся тым багам, якіх мае бацькі і дзяды прызнавалі. І нікога я не баюся, бо нікога не забіваў, нічога не краў...

- Не краў? А хіба ты нічога не браў з тых, каго лячыў? - ваявода ажно наперад падаўся.

- Так, не браў. І каштоўнасцей не збіраў, бо лічу іх непатрэбнымі ў жыцці. Людзей многіх лячыў і вылечваў нават тады, калі іншыя ўжо і не спадзяваліся на поспех, але платы ніколі не браў.

- Не паверу я ў гэта! - ваявода тупнуў нагой.

- А я цябе і не прашу мне верыць!

Вяшчун паводзіў сябе незалежна. Ваявода ўпершыню бачыў чалавека, які трымаўся перад ім смела. Гэта яго і стрымлівала, і цікавіла, ці доўга ён будзе так сябе паводзіць.

- Лепей кажы, дзе каштоўнасці, астатняе мяне не хвалюе!

- У мяне няма каштоўнасцей.

- Ты ведаеш, што мае людзі нават мёртвым языкі развязваюць?

- Мне не развяжуць, бо з тваімі прыслугамі я і размаўляць не хачу. Яны не ведаюць, што такое чалавечая годнасць, і гэтаксама, як і ты, лічаць, што за золата ўсё можна купіць і прадаць.

- Не загаворвай зубы, адказвай, дзе каштоўнасці!

Вяшчун засмяяўся:

- А ты, ваявода, дурань. На такой пасадзе і такая доўбня...

Гаспадар пачаў было размахваць рукамі, але яго перабіў стары дзесяцкі, які ўвесь час маўкліва стаяў побач:

- Ён гаворыць праўду, ваявода. Не знайшлі мы ў яго ніякіх каштоўнасцей. Толькі траўкі ўсялякія, кветкі ды зёлкі, больш нічога.

- Ён іх закапаў, схаваў, вы проста не знайшлі!

- Але ўсе, да каго мы звярталіся, аднагалосна сцвярджалі, што вяшчун лячыў іх бясплатна. Нават мёд і той браць адмаўляўся, хворым загадваў аддаць.

- Бачыш ты на яго... А за што ж ён тады жыў і навошта было ўсялякіх хворых лячыць? Я ў цябе пытаюся, дзесяцкі? - узвыў ваявода.

Вой зрабіў на ўсялякі выпадак пару крокаў назад і адразу ж заціх.

Тут гаспадар зноў накінуўся на вешчуна:

- Золата не любіш?! Каштоўнасцей не маеш?! Навошта мне такі палоннік?!

- А я да цябе ў палон не прасіўся, - змрочна адказаў чалавек са звязанымі рукамі. Жыў сабе спакойна, пакуль твае служкі не прыляцелі ды прыдзірацца не пачалі. І не пайшоў бы, дык яны пачалі пагражаць, што вяскоўцаў пераб'юць. Іх-то за што? Што яны табе благога ўчынілі?.. Вось і вымушаны быў да цябе ў госці завітаць, але я не радуюся гэтаму.

- За гэтыя словы я зараз загадаю цябе павесіць на самым высокім суку!

- За што ж мне такая павага, ваявода? На суку, ды яшчэ на самым высокім? - здзекліва прамовіў вяшчун.

Гаспадар болей не вытрымаў здзекаў, завішчэў, шалёна тупаючы нагамі:

- У пятлю яго! У пятлю! Слугі, чуеце?!

Але ў гэты момант да ваяводы падскочыў дзесяцкі.

- Не рабі, ваявода, гэтага. Не рабі, прашу цябе.

- Чаму? Можа ты яго шкадуеш, ці ён табе спадабаўся?..

- Справа не ў гэтым. Калі ты яго пакараеш смерцю, то можа здарыцца благое...

- Што?

- Паўстануць людзі, якія яго паважаюць, тады ўсім нам будзе канец.

Гаспадар прызадумаўся і зірнуў на вешчуна, які, здавалася, увогуле страціў цікаўнасць да ўсяго, што тут адбывалася.

- Пашанцавала табе. Але толькі на гэты раз. Другі раз не дарую, так і запомні. А зараз ідзі, і папярэджваю - кідай пакланяцца старым багам.

- І не падумаю! - горда адрэзаў вяшчун. - А смерці, ваявода, я не баюся, бо пасля смерці цела прарасце мая душа. Яна не адляціць на неба, яна застанецца тут, на зямлі, і прарасце белай бярозкай, бо ніколі я не рабіў людзям благога. Ніколі... Ты ж, як ні імкніся, на той свет таксама не трапіш - асінай гнуткай і гнілой пасля скону станеш. Памятай і ты, не забывайся...

Развязалі вешчуна, і ён, ні з кім не развітваючыся, пайшоў назад, да тых людзей, ад якіх яго сёння забралі. Гаспадар ледзьве стрымліваўся, каб не закрычаць услед што-небудзь абразлівае. Потым паклікаў да сябе дзесяцкага:

- Скажы, вой, за што яго людзі так любяць? Ён жа не багаты і не вяльможны, у простай вопратцы, нават у лапцях ходзіць...

- Яны, ваявода, яго шануюць найперш за тое, што ён сам з імі добра абыходзіцца. Па-другое, таму, што вылечыў многіх, паставіў на ногі, даў магчымасць сустракаць і праважаць ласкавае сонейка, а гэта не забываецца. Ды і за ўсялякай простай парадай ідуць да вешчуна. Да нас жа з вамі не прыходзяць?

- Не прыходзяць, - ці то паўтарыў, ці то адказаў гаспадар.

З таго дня прайшоў, можа, год, а можа, і болей, і здарылася ліха - у ваяводы моцна захварэў адзіны сын. Ляжаў, бедалага, і ні есці, ні рухацца, нават размаўляць не мог. Якіх толькі варажбітоў і лекараў ні прыводзілі да хлопца - нічога не дапамагала. Гаспадар плакаў горкімі слязьмі. Тут ён пераканаўся, што гора для ўсіх аднолькавае - і для бедных, і для багатых.

- Людзі, людзі, даруйце мне мае грахі! - прасіў ён. - Даруйце і дапамажыце, каб мой адзіны сын устаў! Усё, што маю, таму чалавеку аддам! Сам жабраваць пайду - толькі б сына паставіць на ногі. Ён жа мой адзіны нашчадак!

Людзі толькі разводзілі рукамі і паціскалі плячыма Шкадавалі ваяводу, забывалі яму старыя грахі, здзекі ды кпіны, але дапамагчы не маглі.

Да Бога ён ужо і не звяртаўся, відаць, пераканаўся, што неба застаецца абыякавым да няхай сабе і шчырых але такіх далёкіх ад пазамагільнага свету людзей. Плакаў і лісліва паглядваў на пасланцоў - ад іх зараз залежаў лёс ягонага сына.

- Ну што, прывезлі каго-небудзь?..

Тыя панура маўчалі.

Аднаго разу да ваяводы зайшоў той самы стары дзесяцкі, які цяпер ужо сотнікам быў, пакланіўся нізка і прамовіў:

- А што, гаспадар, калі мы таго вешчуна з пушчы прывязём, якога ты некалі адсюль выгнаў?

- Вязі, толькі б сын выжыў. Усё, што хочаш, абяцай, скажы, што я нічога не пашкадую...

Прывезлі таго вешчуна з лесу. Ён стрымана павітаўся і запытаўся ў гаспадара:

- Дзе ваш хворы? Паказвайце, не цягніце час, гэта да дабра не прывядзе.

Завялі ў пакой да хлопца. Глянуў на яго вяшчун, нахіліўся, за галаву ціхенька пакратаў і прамовіў:

- Загадай, ваявода, тэрмінова вазок лёгкі ў дарогу збіраць ды сына апранай цёпла. Забяру яго да сябе, на месцы лячыць буду. Не палохайся, забыўся я ўжо пра тое, як ты некалі мяне прыніжаў. Чаго ў жыцці не здараецца...

- Дапамажы... Дапамажы... - нібы заведзены, паўтараў гаспадар і парываўся прыпасці да кастлявай рукі вешчуна.

Цяжка, ой як цяжка вярталіся сіла і здароўе да ваяводзінага сына. Можа, і вяшчун сумняваўся ў тым, што здолее нечым дапамагчы, але ні разу такога не прамовіў услых, нястомна паіў усялякімі адварамі ды ўзварамі, прыкладваў лісцікі ды карэньчыкі да збалелага цела.

Ваявода не вытрымаў трох месяцаў, як яму наказаў вяшчун, і, узяўшы ахову, пад’ехаў да той глухой вёсачкі. Калі прыехалі, то першага, каго ўбачылі на прызбе на сонейку, - гэта хворага. Ён ужо паціху мог хадзіць і пры гэтым радасна ўсміхаўся.

Заплакаў шчаслівы бацька і пачаў дапытвацца ў вешчуна, як яму аддзякаваць. Ён добра памятаў, што ні грошай, ні каштоўнасцей той не бярэ. Таму, калі вярнуўся ў палац, паклікаў да сябе старэйшага са слуг і загадаў:

- Едзьце ў тую вёску, дзе ляжаў мой сынок, і там... пасадзіце шмат бярозак. Хай яны нагадваюць пра таго вешчуна і ягоных землякоў, якія яны светлыя і чыстыя душою...

Даўно пайшоў са свету вяшчун, даўно не стала ваяводы, а бярозы тыя шумелі-гайдаліся не адно стагоддзе, захоўваючы памяць пра добрых людзей. Дык тое паселішча і назвалі - Бярозаўка. *(Дадатак 14)*

*(Гродзеншчына: Назвы населеных пунктаў паводле легендаў і паданняў (Склад., запіс., апрац. А.М.Ненадаўца). - Мн.: Беларусь, 1999.)*

## ГУДЫ

Некалі ў паселішчы з сённяшняй назвай Гуды жылі два неразлучныя сябры. Што цікава, абодва мелі адно і тое ж імя, ды так здарылася, што яшчэ пакахалі адну і тую ж дзяўчыну. Да ўсяго іншага, абодва Міколы нарадзіліся ў адзін і той жа дзень і год. Характары мелі аднолькавыя, да працы любыя ды да рознага штукарства. Толькі ў адным яны мелі розніцу. Адзін з Міколаў меў дзіўны музычны слых, умеў граць на розных інструментах, самім ім змайстраваных, а спяваў так, што ўсё навокал замірала ад яго боскага голасу.

Другі ж Мікола свой талент меў у іншым: працаваў ён у мясцовай гуце ды такія вырабляў рэчы са шкла і крышталю, што яны здаваліся як жывыя - будзь гэта кветка або птушка, а кубкі ды іншы посуд так зіхацелі, што немагчыма было адарваць ад іх вачэй.

Так сталася, што ў адзін і той жа дзень Мікола-пясняр і Мікола-гутнік (такія ў іх былі мянушкі для адрознення) заслалі сватоў да сям'і любай ім Ганначкі. Ні бацька, ні маці, ні сама прыгажуня не ведалі, што і рабіць, бо родзічы абодвух Міколаў былі ў вялікай пашане ў акрузе, а тут яшчэ і сэрца маладзёны разрывалася паміж двума віднымі і на ўсё здатнымі хлапцамі.

Вырашылі так. Цераз месяц збяруцца ўсе людзі вёскі, калі закаханыя перамогуць адзін другога ў трох рэчах, ды таго і будзе Ганна.

Першым выпрабаваннем была ралля. Аднавяскоўцы ўважліва агледзелі вынікі працы Міколаў, ды так і не змаглі вылучыць лепшага аратага. Потым спаборнічалі ў бегу. Каля дуба іх чакалі самыя хутканогія аднавяскоўцы. Але плячо ў плячо прыбеглі туды Міколы.

Трэцім было здзіўленне. Кожны прэтэндэнт на Ганулечку асабіста павінен быў нечым адметным захапіць жыхароў сваёй вёскі.

Першым выцягнуў жэрабя Мікола-пясняр. Запеў ён так, што лёгка стала на сэрцы ва ўсіх людзей. Ад яго голасу забыліся яны пра ўсё, ды і прырода заслухалася, нават салаўі замоўклі. І калі скончылася песня, аднавяскоўцы, мабыць, аддалі б яму перавагу, але на чарзе быў яшчэ яго сябра.

Выйшаў Мікола-гутнік, і пабачылі сяльчане ў яго руках клетку з накінутым пакрывалам. Паставіў ён яе ў цэнтры, нізка-нізка пакланіўся ўсім, а самага старэйшага жыхара паселішча папрасіў зняць пакрывала і адчыніць клетку.

Усміхнуўся старэча, падышоў да клеткі і ў момант сцягнуў покрыва. Глянулі людзі, а адтуль - незвычайнае зіхаценне, што нават прыйшлося далонямі крышачку вочы прыкрываць. Адчыніў дзед клетку... І, о, дзіва, выпырхнула адтуль птушачка

незвычайнай красы, абляцела яна ўсіх, ды такія каленцы сваім пошчакам пачала вырабляць, нібыта тыя салаўі. Ды не, лепш і чароўней! Заслухаліся людзі, замаўчала ўсё наўкол, нават кудысьці тыя надакучлівыя мухі падзеліся са сваімі братамі камарамі. Зрабіла гэтая казачная птушачка яшчэ адзін аблёт і раптам высока паднялася ў неба, што жыхарам Гудаў здалося - новае сонца з'явілася, а потым ціха-ціха гэтае пявучае сонейка пачало спускацца ўніз, і села яно на плячо Ганны ды так забілася, зашчоўкала, што людзі кінуліся да Міколы-гутніка, высока сталі кідаць яго ўгару, а потым падвялі яго да любай Ганначкі, абвязалі іх самым раскошным ручніком. А цераз дзень было вяселле.

Вось так і пайшла гуляць па свеце слава пра Гуды.

А Мікола-пясняр узяў сабе ў жонкі сястру Ганны Марыську і ад'ехаў з сяла. Гавораць, што заснаваў іншае паселішча і там жа паставіў печ і нешта ўсё вырабляў са шкла, але так да вяршынь майстэрства свайго сябра і не дайшоў. Месца, дзе ён жыў са сваімі нашчадкамі і новымі насельнікамі, людзі назвалі Гуткамі. *(Дадатак 15)*

*(Маліноўскі, М. Ці гудзеў Гуд у Гудах // Лідская газета. -1998. - 25 ліпеня.)*

ДВОРЫШЧА

На тым месцы, дзе зараз знаходзіцца вёска Дворышча (а як паказвае карта Лідскага павета ў канцы XVI стагоддзя, яна ўжо і тады стаяла), на рацэ Жыжма пабудаваў сабе добры дом панскі любімец і рыбак, які свайму гаспадару пастаўляў свежую, сушаную і вэнджаную рыбу. Было такое правіла, што па суботах ён павінен быў асабіста пастаўляць яму найлепшую рыбу - стронгу. Перад гэтым днём слуга пана займаўся сваім промыслам, не ўбярогся, зранку адчуў сваю немач, а сям'я яго была вялікая - шэсць сыноў і чатыры дачкі. Засмуцілася жонка і нашчадкі, а тутака яшчэ непагадзь - навальніца з маланкамі-бліскавіцамі. Але панскі загад трэба было выконваць, узяў яго ўлоў здатнейшы на гэтае рамяство сын Міхал. Агледзеў гаспадар рыбную здабычу, спадабаўся яму хлопец, ды і вырашыў пакінуць яго ля сябе. Хоць і рвалася сэрца юнака дамоў, але вымушаны быў падпарадкавацца пану.

Прыйшла новая субота, за ёй нядзеля, а ад рыбака ні ўлову, ні аніякіх звестак. Адчуў нешта нядобрае пан, загадаў прывесці яму каня і сядлавацца таксама ўпраўляючаму і Міхалу, і паімчаліся яны да ракі Жыжма. Пры пад'ездзе іх чамусьці ніхто не сустракаў, не было чуваць ні брэху сабакі, ні гукаў пеўня ды і дымок не віўся з коміна хаты, І пан, і ўпраўляючы, а яшчэ больш Міхал адчулі ў сабе трывогу-бяду. Так, на месцы пабудоў было вялікае папялішча...

Зжаліўся гаспадар над сынам свайго любімага і ўвішнага рыбака, даў дазвол на будаўніцтва на папялішчы-дворышчы новага дома. Сам выбраў яму працавітую і прыгожую дзяўчыну Ганну, ажаніў іх і нарадзілася ў Міхалавай сям'і 14 дзетак, праўда, двое пры родах памерлі. Але астатнія ўсе былі ладныя, дужыя і працавітыя. Пачалі яны жаніцца і выходзіць замуж, хутка паселішча стала вялікім. А назву свайго папялішча-дворышча захавалі, так з таго часу і завецца яно Дворышчам. Гэтак яно ці не? Так расказвалі людзі. *(Дадатак 16)*

*(Маліноўскі, М. На папялішчы ... узнікла Дворышча? // Лідская газета. – 1998. - 5 верасня.)*

## КРУПАВА

Жыў некалі тут хлопец, звалі яго - Крупеня. Сам з сябе нічога такі ўрадзіўся: высокі, плячысты, не асілак, але і не слабы, калі трэба было за сябе пастаяць ці дзе якую справу кулаком даказаць, то і гэта мог зрабіць без чужой дапамогі. Вёска ж была не маленькая, але і не вялікая. Людзі хто чым займаліся, але ў асноўным зямельку аралі ды засявалі - з таго і жылі, з таго і карміліся. Некаторыя борці па лясах стаўлялі і мёдам гандлявалі, іншыя паляваннем сям'ю падтрымлівалі ці рыбнай лоўляй. Адным словам, усім справа была, абы толькі не сядзелі, склаўшы рукі, а шчыравалі.

Крупеня той быў адзіны сын у бацькоў. А бацькі ягоныя мелі багата зямлі і нават вятрак - млын, з дапамогай якога граблі яны грошы, што лапатай зямлю. Якую скажуць цану, такую селянін і плаціў. А не хочаш плаціць - бяры жаронцы і круці ўручную. Але ж ці многа накруціш? Таму і ішлі на паклон, таму і трывалі здзекі ды кпіны.

Сын іхні ўрадзіўся хітрым і надта жвавым, а ўжо такі падкі да жанчын быў, што і бацькі не ведалі, у каго ён пайшоў. Ніводнай паўз сябе не прапускаў, каб не зачапіць, не пацiскаць, а калі даведваўся, што недзе паблізу, а то і далёка, жыве жанчына вольных паводзін, то і туды наведваўся. А потым пеўнем хадзіў сярод вяскоўцаў і пахваляўся.

Бегаць-то ён бегаў, ды здарылася так, што сам пачаў хінуцца да адной мясцовай дзяўчыны, якую звалі Гэлькай. І што дзіўна - была яна зусім непрыгожая, дробненькая, змізарнелая, здавалася, што яе нехта пастаянна крыўдзіў і Гэлька была вечна незадаволена і жыццём, і тым, што адбывалася навокал. Праўда, яе бацькі мелі багата грошай, так што тут Крупеня не пралічыўся.

Пачаў ён да Гэлькі наведвацца. А тая, калі ён прыходзіў, сядзела сабе ціхенька, і нельга было зразумець, ці радуецца яна, ці пра нешта іншае думае. Мабыць, надакучыла хлопцу проста так хадзіць, і ён сказаў бацькам:

- Бацька, маці, надумаў я жаніцца...

Тыя ажно з лаўкі ўскочылі ад радасці.

- Вось добра, сынку, вось малайчына. Мы не супраць. А з кім жа ты пабрацца хочаш, да каго сватоў пасылаць?

- Чаго далёка хадзіць? Вунь да Гэлькі і пасылайце.

Усяго чакалі бацькі, толькі не гэтага. Першым ачомаўся бацька:

- Што ж ты, сынку, лепшай дзеўкі сабе выбраць не мог? Яна ж такая непрыгожая ды худая, што ад ветру пераламацца можа. Ходзіць нейкая перакрыўленая, незадаволеная...

- Не дамо сваёй згоды! - катэгарычна запярэчыла і гаспадыня.

- Не дасце - і не трэба! - са злосцю мовіў Крупеня,ляснуў дзвярыма і некуды прапаў ажно на тры дні.

Калі вярнуўся, то на запытанне, дзе гэта ён лазіў, пачулі ў адказ:

- Дзе трэба, там і хадзіў. А з вамі, пакуль да Гэлькі сватоў не пашлеце, увогуле размаўляць не буду.

З паўгода варагавалі бацькі з сынам. Нарэшце бацька не вытрымаў і, са злосці плюнуўшы, сказаў:

- Хай на кім хоча, на тым і жэніцца! Наша справа якая? Не нам жа бедаваць, а яму, дурню гэтаму. Пашлём сватоў, так і быць. Няхай радуецца.

Папрасілі бацькі суседа і яшчэ аднаго вяскоўца, і ў святую нядзельку сваты разам з Крупеням пайшлі да Гэлькі ў хату дамаўляцца наконт вяселля і ўсяго іншага, што ў такіх справах неабходна.

Тут і здарылася самае цікавае. Калі Гэльку паклікалі да гасцей, то яна ўпала перад сваімі бацькамі на калені і запрасілася:

- Родненькія, міленькія, не хачу я замуж за Крупеню ісці. Не аддавайце мяне, бо згубіце вы душу маю нявінную...

Пачала галасіць, валасы на галаве рваць. Тут бацька не вытрымаў, ухапіў дзягу ды пачаў яе лупцаваць, прымаўляючы:

- За каго скажу - за таго і пойдзеш! Не будзеш мяне перад людзьмі ганьбіць ды паганіць! Вон з хаты і чакай на вуліцы!

Дзяўчына, збітая, ледзьве выпаўзла з дзвярэй, прыхілілася да вішанькі ў садочку дый заплакала горка:

- Утаплюся, але за Крупеню не пайду, жыць з ім нестану.

Мабыць праведаўшы, што сваты да Гэлькі прыйшлі, прыбег сюды другі хлопец - Іван, які кахаў дзяўчыну і да якога, як потым аказалася, яна сама хінулася. Бедалага яму ўсё і расказала. Іван заплакаў і з болем у душы вымавіў:

- Раз ужо так атрымалася, то ідзі за яго. Ён жа багаты. А я... Ды і бацькі твае ад свайго не адступяцца. Што тут зробіш? Лёс у мяне такі нешчаслівы...

Гэлька раптам сурова прамовіла:

- Калі і выйду за яго, то дзіця ад цябе будзе! Пайшлі ў нашу лазеньку! Хутчэй, пакуль яны там выпіваюць!

А Крупеня стаяў непадалёку і ўсё чуў. Счакаў ён хвілін колькі і следам прыпусціў. Узяў здаравеннае палена, падпёр ціхенька дзверы і падпаліў лазеньку, а сам адбегся да Гэльчынай хаты.

Людзі пачалі гарлаць, што пажар, павыбягалі ўсе і пачулі крыкі і ў лазеньцы. Адчынілі дзверы і выпусцілі Гэльку з Іванам. Ніхто не дапытваўся, чаго яны там апынуліся, - не да гэтага было. Агонь пачаў перакідвацца з аднаго дома на другі, бо будыніны амаль што датыкаліся адна да другой, і да вечара амаль уся вёска выгарала, толькі галавешкі дыміліся. Ацалела толькі пакрыўленая лазенька ля самага лесу, і нехта з іроніяй прамовіў:

- Эй, людцы, гэта ж... Крупенева...

Крупеню вяскоўцы прагналі ад сваіх папялішчаў, каб ішоў у белы свет і там сабе новых сябрукоў шукаў, бацькі яго памерлі, а новую вёску, якую пачалі будаваць ля той адзінай лазенькі, называлі то Крупенева, то Крупава. Потым толькі Крупава засталося. *(Дадатак 17)*

*(Гродзеншчына: Назвы населеных пунктаў паводле легендаў і паданняў (Склад., запіс., апрац. А.М.Ненадаўца). - Мн.: Беларусь, 1999.)*

## КРЫНІЦА

Даўным-даўно была тут недзе, зусім недалёка, крыніца. Людзі пілі з яе ваду летам і зімой, бо яна не замярзала, і здзіўляліся, якая яна халодная ды сцюдзёная, якая чысцюткая - нібы дзіцячая сляза, як яна сілы аднаўляла. Таму да гэтай крыніцы падчас сенакосу ці сенажаці людзі спяшаліся. Старэйшыя маладзейшым так падказвалі: “Не дакасі гэты пракос (ці не дажні гэты сноп), а збегай да крыніцы ды вадзіцы напіся. Адразу нібы нанова народзішся, адчуеш, што такое зямная сіла”.

Людзі параіліся і вырашылі зрабіць вакол крынічкі зруб, бо да яе і жывёлы ўсялякія піць падыходзілі. Вяскоўцы, канешне, былі не супраць таго, каб яны пілі, але хацелі, каб пілі толькі тую ваду, якая пералівалася б праз край.

Зрабілі добрую справу, нават гарлачык павесілі, каб падарожным, ды і тубыльцам, зручней піць было. І ўсё добра было б, калі б не адзін выпадак. Ішлі дарогай, паўз крынічку, два падарожныя. Здалёк, мабыць, свой шлях трымалі, бо ледзьве ногі

перасоўвалі. Адзін з іх быў крыху маладзейшы, але затое і злейшы. Хоць з людзей пабіраўся, але мала калі дабром адплачваў, хутчэй наадварот. Ушчуваў яго таварыш, ды мала словы дапамагалі.

- Глядзі, якая крынічка. Зруб стаіць, гляк вісіць, бяры, пі, ды дзякуй не забывайся сказаць, - задаволена вымавіў стары.

- Ага, так я ім і скажу! За ваду гаварыць дзякуй!

Што яны тут, студню глыбокую капалі, гарбаціліся? Сама вадзіца на паверхню выбілася, сама сабе і дарогу знайшла...

Селі адпачываць ля крыніцы. Напіліся вады і расцягнуліся на траўцы. Потым малодшы раптоўна падхапіўся.

- Ты куды? Што ўдумаў? - запытаўся старэйшы, але той не спяшаўся адказваць і нешта таропка шукаў у кішэнях.

- Што ты надумаў?

- Яны, мясцовыя жыхары, грошай, відаць, да гэтага часу не бачылі і не ведаюць, што гэта такое. У мяне недзе капейка была. Кіну яе ў ваду - яны і пачнуць ад грошай шалець. Скончыцца іх мірнае жыццё, будуць яны адзін на аднаго скоса глядзець, ваўкамі зырыць. Яны ў мяне спазнаюць, што такое ліха!

- Навошта ты такую бяду людзям ні ў чым не павінным чыніш?

- Каб яны ў нечым вінаватыя былі, дык я ім не так жыццё сапсаваў бы.

Знайшоў ён такі тую зласчасную капейку і ўкінуў у празрыстую вадзіцу. Потым і закамандаваў на старэйшага:

- Давай адыдземся ды падглядзім, як тубыльцы ля крыніцы будуць сябе паводзіць.

Таму нічога іншага не заставалася, як падпарадкавацца. Малодшы не толькі нораў больш суровы меў, але і сілы ў яго было паболей. Не пагоднішся - то і кухталёў надае, доўга ўпрошваць ды размаўляць не будзе.

Селі яны непадалёку, у густым кустоўі. У хуткім часе да крыніцы падышла маладзіца, нахілілася з гляком і, мабыць, заўважыла, што на дне нешта ляжыць і ярка свеціцца. Закарцела ёй даведацца, што гэта такое, таму перагнулася праз край і гопнулася ў ваду - толькі пырскі паляцелі.

Малодшы падарожны ажно па зямлі качаўся ад рогату. Старэйшы спачатку пазіраў, то на яго, то на маладзіцу, але хвілін праз колькі і ён корчыўся са смеху.

Маладзіца ледзьве выбралася з таго зласчаснага зруба і, адплёўваючыся ды на чым свет стаіць лаючы крыніцу, пайшла прэч.

- Чакай, яшчэ не тое пабачыш. Гэта толькі пачатак, зараз самае вясёлае пачнецца, - падзуджваў старога малодшы.

І сапраўды, можа, праз якія паўгадзіны побач з крыніцай спыніўся воз, і з яго саскочылі два ладныя дзецюкі. Пасміхваючыся, падышлі да вады і, глянуўшы ў крыніцу, ажно раты ад здзіўлення разявілі. Потым адзін з іх як крыкне:

- Маё! Маё! - і нахіліўся над вадою. Але нават рукі не паспеў працягнуць, бо яго са ўсяго маху агрэў па галаве другі. Той даў сябруку здачы, і пайшло ў іх, паехала: крычалі, енчылі, стагналі ад болю, лупцуючы адзін аднаго.

Малодшы падарожны ў кустоўі радаваўся:

- Дай яму! Дай! Мацней трэсні, мацней, каб мала не падалося!

Нарэшце знемаглі тыя дзецюкі іляглі на траву побач з крыніцай. Толькі і маглі, што дацягнуцца рукамі да вады і да скрываўленых твараў паднесці.

- Што ж ты нарабіў, дурань?! - закрычаў старэйшы вандроўны.

- Сам бачыш! Так мы прайшлі б і знаку не пакінулі, а так яны мяне да скону жыцця памятаць будуць. Адна ледзьве не ўтапілася з-за сваёй цікаўнасці, а гэтыя ледзьве не пазабіваліся з-за ўласнай сквапнасці. Ды ці адзін тут яшчэ гуз наб'е ці нос рассадзіць? Пайшлі, няма чаго нам тут болей рабіць, - сказаў малады і шпарка пакрочыў далей.

- А местачкоўцы як пачалі ля той крыніцы валтузіцца, як сталі ў ёй ваду каламуціць, то праз колькі часу яе нельга было піць. Болей таго, дваіх чалавек да смерці забілі. Сталі тады сяляне меркаваць, як далей быць, што рабіць, каб вярнуць крынічцы былую славу. Доўга нічога слушнага ніхто не мог запрапанаваць, пакуль нехта не сказаў, можа, і не надта спадзеючыся на тое, што словы гэтыя пачуюць:

- Я так, браточкі, мяркую. Тут без бацюшкі нам не абысціся. Трэба па яго пасылаць і прасіць, каб тэрмінова дапамог ад бяды вызваліцца...

- А што? - ухапіліся астатнія за прапанову. - Слушна чалавек гаворыць. Трэба за бацюшкам паслаць. Эй, хто там больш жвавы, джгайце да вёскі! Ды няхай бацюшка начынне сваё возьме, бо яно, відаць, спатрэбіцца.

Бацюшку чакалі доўга. Нарэшце ён прыйшоў, і не адзін, а з дзякам. Распытаў, што да чаго, толькі не зразумеў нічога, пакуль капейку ў вадзе не заўважыў.

- О, - кажа, - гэтую бяду я адным пальцам развяду. Прымусіў дзяка залезці ў крыніцу і дастаць капейку.Калі той, ляскаючы зубамі ад холаду, вылез, то бацюшка капейку забраў сабе ў кішэню, потым асвяціў зруб, ваду і прамовіў павучальна:

- Каб болей з вамі ніякага ліха не здаралася, трэба, людзі добрыя, вам ля крыніцы капліцу святую пабудаваць. Тады Усявышні над усім наваколлем апекаваць будзе.

Так і зрабілі. Колькі стагоддзяў з таго часу прайшло - ніхто вам і не скажа. Капліца даўно згніла, засыпалася, а вось назва засталася. Так і вёска стала - Крыніца. *(Дадатак 18)*

*(Гродзеншчына: Назвы населеных пунктаў паводле легендаў і паданняў (Склад., запіс., апрац. А.М.Ненадаўца). - Мн.: Беларусь, 1999.)*

## ЛЕСНІКІ

У адной багатай сям'і нарадзілася дзяўчынка, а пан з пані ўжо ў сталым узросце былі, асабліва пан. Таму праз пару гадоў чалавек гэты цяжка захварэў і неўзабаве памёр. Засталася гаспадыня з малой дачкой на руках, глядзець за якой яна нікому не давярала, усё рабіла сама. А калі ўлічыць, што трэба было наглядаць і за вялікай гаспадаркай, і за тым, як справы ідуць, і за тым, каб нідзе не абкруцілі хітрыя ды сквапныя войты, то стане ясна - спраў у яе хапала. Але ж пані не скардзілася, старалася, каб усё было як мае быць.

Зайздросцілі сквапныя суседзі, якія спадзяваліся, што за год-другі здолеюць праглынуць землі сваёй суседкі. Ды дзе там! Тады яны пачалі дзейнічаць іншым шляхам, спадцішка то нешта ўкрадуць, то людзей мясцовых з поля пазганяюць. А апошнім часам зусім сорам страцілі - сталі панскі лес секчы і лепшыя бёрны да сваіх сядзіб звозіць. Гаспадыні вяскоўцы гаварылі пра гэта, але ж за руку не злавіў - не маеш права ў пакражы абвінавачваць.

Аднаго разу пайшла яна з дачушкай, якой было ўжо, можа, гадоў дзесяць, на кірмаш. Вёсачка тая была недалёка ад палаца, усяго з вярсту якую, таму ішлі нетаропка, размаўлялі. Вось ужо і вёска пачалася, і тут дачка гаворыць:

- Мама, глядзі, вунь хлопчык маленькі чамусьці плача. Усе песні спяваюць, а ён плача.

- Давай запытаемся.

Падышлі да таго хлопчыка, якому прыкладна было столькі ж гадоў, колькі і малой панначцы, і пані спыталася:

- Чаго ты, хлопчыку, плачаш? Усе радуюцца святу, весяляцца, а ты слёзы льеш?

- Як жа мне не плакаць? Усе нешта смачнае сёння елі, чыста апрануліся, а ў нас на стале сёння і хлеба не было, адна пустая лебяда. Апранахі таксама няма. Таму і не іду да сябрукоў, таму і не радуюся...

- А дзе ты жывеш?

- Ды тут, недалёка, вунь у той старэнькай хатцы.

- А бацька ў цябе ёсць?

- Так, і татка, і мамка, і сястрычак ды брацікаў многа. Але карміцца нам няма з чаго, таму так блага і жывём.

- Пайшлі да тваіх бацькоў. Можа, я іх і ведаю...

Прывёў іх хлопчык у хату, а там і сапраўды такая галеча, што і есці няма чаго, і апрануць, нават лавы, каб сесці, не аказалася.

- Як жа вы жывяце? - здзівілася пані, звяртаючыся да гаспадара.

- Ды як Бог пашле, так і выкручваемся. Спачатку на лёс наракалі, а потым перасталі, бо ўбачылі, што ўсё супраць нас. Некалі бацька мне зямлі даў крыху, жонцы на пасаг таксама перапала, але як ні працавалі - поле не радзіла. Першыя гады мы думалі, што, можа, нешта не ўмеем. Таму ў людзей пыталіся, прыглядаліся, як яны робяць, - усё дарма, бо ў нас ніва і намнога чысцейшая была, і лепей угноеная, проста не радзіла - і ўсё на тым. Варажбітоў таксама прыводзілі, каб тыя праверылі, ці не наслалі чаго ліхія людзі. Аднак і гэта не дало станоўчых вынікаў.

- Так, невясёлая справа, - прамовіла пані.

- Ніва наша не радзіла, а дзеці, самі бачыце, нараджаліся. Спачатку бацькі дапамагалі: то зерня крыху падкінуць, то бульбы, а то і скварку, але цяпер ім самім дапамагаць трэба, бо ўжо ледзьве ходзяць. Таму, пані, у нас і нявесела нават у гэты святочны дзень.

- Шкада мне вас, людзі. Ведаю я вас, не раз бачыла, як вы шчыра ды самааддана на ніве працавалі, але не чакала, што гэтак блага жывяце.

- Ды самі мы як-небудзь жылі б. Іх шкада, - выдыхнуў гаспадар з такой скрухай у голасе, што, здавалася, яшчэ імгненне і ён заплача горкімі слязьмі.

- Не трэба ні самім паміраць, ні дзяцей да гэтага даводзіць. Трэба што-небудзь прыдумаць...

- Ды мы ўжо па-ўсялякаму, пані, думалі і рабілі - нішто не дапамагае. Відаць, закляты мы нейкім праклёнам, які ляжаць будзе і на нашых нашчадках...

- Не трэба так гаварыць, што-небудзь прыдумаем...

Я сама прыдумаю, - запэўніла пані і, адышоўшы на пару крокаў ад гаспадароў, задумалася.

Прайшло хвілін дзесяць. Муж з жонкай не ведалі, што рабіць, таму моўчкі стаялі і назіралі за нечаканай госцяй, а дзеці спалохана ціснуліся адно да аднаго. Яны яшчэ ніколі ў жыцці не бачылі гэткай прыгожай і багата апранутай жанчыны.

- А калі так... - нібы сама да сябе звяртаючыся, прамовіла пані і павярнулася да гаспадароў. - А калі мы з вамі вось што зробім. У мяне нехта лес крадзе... Я здагадваюся, хто гэта робіць, але хачу ўпэўніцца і пакласці гэтаму канец. Таму мяркую

пасяліць у лесе палясоўшчыка. Ці не пагодзіцеся вы туды перабрацца? Там пракарміцца будзе значна прасцей: грыбы, ягады, рэчка лясная цячэ, рыбы ў ёй заўсёды многа, часам і звер які натрапіць. Лесу на хаціну я вам дам, на гаспадарчыя пабудовы - таксама. Нават людзей сваіх на падмогу падкіну, каб да восені ўсё адбудавалі. Там і невялічкія палянкі-лапінкі ёсць, на іх можна і жыта сеяць, і авёс, і што іншае, калі трэба. Разумею, што за год-два вы мне не аддзячыце, але жыццё ж доўгае, ды і нашчадкі растуць...

Гаспадары бухнуліся ў ногі: - Пані, родненькая, збавіцелька ты наша, мы за цябе і за тваё здароўе Богу ўсё жыццё маліцца будзем!

Так на месцы і вырашыла пані самую цяжкую праблему ў жыцці беднай сям'і - як жыць далей. З таго дня пачаў гаспадар ахоўваць панскі лес. Стараўся, каб не падвесці чалавека, які ягоных дзяцей ад смерці ўратаваў. Будыніны спраўныя да восені паставілі, пасеялі на зіму жыта. І справа пайшла на лад. З кожным годам тым гаспадарам усё лягчэй і лягчэй жылося. Ураджай добры здымалі, дзеці падраслі і пачалі дапамагаць, а самае галоўнае - стала шанцаваць ім ва ўсім.

Той род увесь на тым самым месцы і жыў: і дзед, і бацька, і сыны, і іхнія нашчадкі. Таму калі вёска стала, то назвалі яе па занятку - Леснікі. *(Дадатак 19)*

*(Гродзеншчына: Назвы населеных пунктаў паводле легендаў і паданняў (Склад., запіс., апрац. А.М.Ненадаўца). - Мн.: Беларусь, 1999.)*

## М. ЛЕБЕДЕВО

Въ Виленской Губерніи, въ Виленскомъ УѢздѢ, находится М. Лебедево, расположенное по обѢимъ сторонамъ небольшаго ручейка. Объ основаніи его сохранилось между селянами слѢдующее преданіе: На томъ мѢстѢ, гдѢ теперь М. Лебедево, когда-то, въ незапамятное время,было непроходимое, бездонное, болото, поросшее густымъ кустарникомъ. Какой-то Русскій чѢловекъ, поселившись на сосѢдней горѢ, началъ копать колодезь. Долго трудился онъ надъ своимъ дѢломъ, и никакимъ образомъ не могъ добыть себѢ воды. Наконецъ онъ рѢшился оставить это мѢсто и начать копать колодезь въ другомъ. Трудъ его, однако, даромъ не пропалъ: на завтрешній день утромъ, онъ выходитъ изъ своего дома и, къ немалому удивленію, слышитъ необыкновенный шумъ и трескъ, какъ отъ пушечнаго выстрѢла. Подошедши къ знакомому мѢсту, онъ увидѢлъ, что вода быстро с трескомъ и шумом вырывается изъ земли и бьетъ ключемъ на нѢсколько саженей вверхъ. Отсюда съ этих поръ потекла рѢчка, которую онъ назвалъ Лебедянкою, что яко бы значитъ не пропавшій трудъ. Удивившись такому необыкновенному явленію Русскій человѢкъ возратился домой и

оставался жить на прежнемъ мѣстѣ. Къ нему все больше и больше изъ разныхъ мѣстъ сталъ собираться народъ; черезъ нѣсколько времени образовалось цѣлое селеніе, которое было названо старымъ. Въ этомъ же селеніи, для совершенія Богослуженія, была построена и каменная церковь, такъ какъ поселившійся народъ здѣсь былъ все Русскій, Православный. Но вотъ одно страшное обстоятельство заставило жителей переселиться на другое, болѣе удобное, мѣсто. Въ одинъ праздничный день много собралось людей въ церковь къ обѣднѣ, и не извѣстно, по какой причинѣ, во время совершенія литургіи, раздался подземный гулъ и трескъ, въ слѣдствіе чего земля разверзлась, и уерковьъ, со всѣмъ, находящимя въ ней народомъ, въ одно мгновеніе провалилась. Тогда всѣ, оставшіеся въ живыхъ, опасаясь, чтобы и съ ними не случилось тоже, забрали кто что имѣли и расположились несколько дальше по обѣим сторонамъ речки Лебедянки. Къ нимъ болѣе и болѣе сталъ присоединятся народъ и съ теченіем времени, образовалось цѣлое мѣстечко, извѣстное теперь поъ именемъ Лебедева.

*(Захаваны аўтарскі тэкст. Крачковский, Ю.Ф. Быт западно-русского селянина // Чтения в О-ве истории и древностей российских при Московском университете. 1873. К.4. М., 1874. С. 210-211)*

МАЦЭВІЧЫ

Ад Мацея, які некалі жыў тут, пайшла назва вёскі. Такі ўжо штукар быў, што людзі яго з замілаваннем згадваюць. А калі хто якую штуку выкіне, то і зараз скажуць:

- Няйначай Мацеевы ўнукі пастараліся, іншыя да гэткага не дадумаліся б.

Кажуць, ён з дзяцінства такі быў, і згадваюць наступны выпадак.

Аднаго разу Мацееў бацька запрасіў суседа дапамагчы гумно крыць. Да полудня ні хвілінкі не адпачывалі мужчыны, усё працавалі, а потым гаспадар і кажа: - Пайшлі, чалавеча. Праца працай, а перакусіць трэба, бо да вечара яшчэ далёка, а сіла сама па сабе не адновіцца.

Селі яны за стол. Гаспадыня забегала вакол іх - усё самае лепшае ставіць, каб чужы чалавек потым благога слова не сказаў пра іх, што пашкадавалі ці схавалі нешта. Вось есць той сусед ды нахвальвае, што ўсё так смачна. Гаспадары некуды на хвіліну адлучыліся, і тут з-за печы паказалася Мацейкава галава:

- Ты, дзядзька, есці еш, але не забывайся пра тое, што і мне пакінуць трэба. Ды не самага горшага і не таго, што сам ужо паспрабаваў...

Чалавек той лыжку ўзняў, а да рота так і не данёс. А тут і гаспадар вярнуўся ў хату:

- Што гэта ты, суседзе, не ясі?

- Дзякуй, - адказвае той. - Я ўжо наеўся, - а сам на печ са злосцю паглядае.

Гаспадар так і не зразумеў, чаму сапсаваўся настрой у чалавека. Дапрацавалі яны да вечара, а на вячэру сусед і ў хату не пайшоў, спаслаўшыся на тэрміновыя справы дома. На тым і разышліся.

Такім і вырас Мацей. Асабліва любіў пасмяяцца над багатымі ці над бацюшкам. Чамусьці служак Бога ён болей за ўсё не любіў. Чым ужо яны гэтак дапяклі яго - і да гэтата часу невядома, а вось чым той вясковец бацюшку адплаціў - і зараз яшчэ даволі часта пераказваюць. А здарылася вось што.

Аднаго разу з бацюшкавага падворка ўкралі двух самых лепшых канёў. Зрабіў гэта, як вы здагадаліся, Мацей. Загнаў ён коней у далёкае мястэчка на кірмаш і там выгадна прадаў цыганам. На добрым падпітку дамоў дабраўся, а ў вёсцы перапалох: гамана, крыкі, матушка плача, валасы гатова на сабе рваць, а бацюшка напіўся з раніцы. Яшчэ б! Такіх коней зладзеі пакралі! Вартаўніка-небараку так адлупцавалі, што той ляжаў пад страхой і вохкаў.

А Мацей, не быў бы ён Мацей, адляжаўся пасля моцнай п'янкі і вырашыў яшчэ над бацюшкам пасмяяцца. Пайшоў да ягонай хаціны дый кажа:

- Я, бацюшка, грэх невялікі маю...

- Адчапіся, не да цябе зараз!

- Замаліць жа мне яго трэба...

- Бачыш, у мяне гора вялікае.

- Бачу, але ж і грэх немалы. Хачу, каб вы мне яго сёння ж адпусцілі.

- Добра, кажы, не дуры мне болей галавы.

- Справа ў тым, бацюшка... Гэта я ў вас коней украў...

У бацюшкі ледзьве вочы не павылазілі, але ён хутка авалодаў сабой і пачаў лісліва:

- Добра, Мацейка, што не ўтоіў, прызнаўся, болей таго - прыйшоў пакаяцца.

- Ды надакучыла, бацюшка, грэх на душы трымаць. Самі ж разумееце...

- Канечне... Разумею, але грэх сыдзе пры адной умове: калі ты сам у царкве пра гэта пры ўсім народзе скажаш. У нядзельку прыходзь і пасля малебна раскаешся.

Пачухаўся Мацей:

- Пры народзе яно неяк і не вельмі прыдатна...

- Красці таксама непрыгожа.

- Тады, бацюшка, згода. У нядзельку прыйду.

Прыспела тая нядзелька. Бацюшка, задаволены, нешта спяваў, не вельмі падобнае на божыя малітвы, - Мацея чакаў. Сяляне, якіх папярэдзілі, што пасля малебна нешта адбудзецца, чакалі, ціха перамаўляючыся паміж сабой.

Нарэшце наперад выйшаў Мацей, і бацюшка звярнуўся да вяскоўцаў:

- Людзі, слухайце ўважліва. Усё, што скажа ваш аднавясковец, - чыстая праўда!

Кашлянуў Мацей раз, другі і пачаў даволі бойка:

- Родненькія мае, вось што я вам хачу сказаць. Усе дзеці ў нашай вёсцы, якія рыжыя, - гэта бацюшкава работа...

Рагатаў народ так, што, здавалася, нават святыя на сценах пачалі пасміхвацца.

Мацей не толькі сам такім быў, але і на нявестку яму пашанцавала. Маладзіца таксама за словам у кішэню не лезла.

Аднаго разу, ужо цяжарная, яна села з Мацеем есці. Пазіраючы на яе вялізны жывот, ён і кажа:

- Не еж надта многа, бо ты і так поўная...

Жанчына спакойна паела, а калі гаспадар загадаў ёй паставіць у печ гаршчок з бульбай, то яна бульбы насыпала і паставіла. Мацей ледзьве з лаўкі не грымнуўся:

- Што ж ты робіш? Ваду налі!

А тая адказвае:

- Навошта, ён жа і так поўны...

Вось так весела і жыў Мацей. Даўно ён памёр, але засталіся на зямлі ягоныя нашчадкі і ўспаміны пра ўсялякія смешныя здарэнні, галоўным героем якіх быў Мацей. Таму і вёску тую, дзе ён некалі жыў, Мацэвічамі назвалі. *(Дадатак 20)*

*(Гродзеншчына: Назвы населеных пунктаў паводле легендаў і паданняў (Склад., запіс., апрац. А.М.Ненадаўца). - Мн.: Беларусь, 1999.)*

## МІНОЙТЫ

Па расказах старажылаў, калісьці ў гэтым месцы, дзе цяпер вёска, навокал распасціралася гібкая непраходная багна. Ні ў весну, ні ў восень, як кажуць, не прайсці, не праехаць. Да гэтага балота падступалі змрочныя, дрымучыя лясы. Непадалёку ад гэтага месца размяшчаліся невялічкія пасяленні. Людзі тут гандлявалі, займаліся рамяством, палявалі, лавілі рыбу. Балота аддзяляла некалькі вёсак ад мястэчка і тракту. Абрыдла кожны раз кладкі насцілаць, і каб лепш і хутчэй было дабірацца з аднаго месца ў другое, над самым багністым месцам быў пабудаваны невялічкі мост. А быў ён такі вузенькі, што пераехаць магла толькі адна павозка або брычка. Усім было добра, хоць і нязручна.

Але вось аднойчы, увечары, пасярэдзіне гэтага маста сустрэліся дзве брычкі пановы, якія вярталіся з палявання. І трэба ж таму здарыцца, абое былі такія ўпартыя, што не захацелі ўступіць дарогу адзін аднаму.

- Мінай ты, - крычыць адзін.

- Мінай ты, - крычыць другі.

Але толку з гэтага было мала. Насупіўшыся, яны рушылі адзін аднаму насустрач. На гэтым спрэчка іх закончылася, таму што цягучая багна забрала іх да сябе. Людзі, якія чулі гэтую спрэчку, разнеслі яе па ўсім свеце.

Прайшоў час, людзі забыліся пра тую бяду, асушылі балота і пачалі сяліцца ў зручным зацішку - на дне былога балота. Час-часам, а легенда зноў усплыла ў памяці людзей.

Вось з таго выпадку быццам бы і знайшлося імя вёсцы - Мінойты.

*(Запісалі падчас экскурсіі ў Мінойтаўскай сярэдняй школе)*

## МІНОЙТЫ

Кажуць, некалі праз вёску праходзіла даволі вузкая дарога, на ёй ледзь маглі размінуцца дзве нагружаныя фурманкі. Калі сустракаліся тут два вазы, людзі ветліва стараліся ўступіць адзін другому дарогу, кажучы: "Мінай ты". Другі ў адказ: "Не, мінай ты".

*(Запісалі ад Куляша Анатоля Фёдаравіча (1927 г.н.), лідскага краязнаўцы)*

## МЫТО

У далёкія-далёкія і старадаўнія часы на месцы, дзе зараз знаходзіцца вёска Мыто, мелася граніца паміж двума ўладаннямі. Адзін з гэтых уладароў быў надта грозны, сквапны і жорсткі, ад яго цярпелі ўсе: і свае людзі, і звеactive, і купцы. Усё жывое ён аблажыў вялікімі подацямі, а прыезджых, гандляроў і падарожнікаў абдзіраў да апошняй ніткі... Людзі беглі з уладанняў гэтага нелюдзя, а купцы ці па рацэ або па дарозе імкнуліся незаўважна праскочыць яго маёмасную зямлю. А каб ніхто не змог таемна праслізнуць, гаспадар гэтай тэрыторыі загадаў пабудаваць мытную заставу на рацэ Дзітва. Мытнікі не так збіралі пошліну з купцоў, як найбольш забівалі гандляроў і рабавалі іх тавары. Жорстка яны адносіліся і да беглых. Спачатку іх трымалі ў ямах, напоўненых сцюдзёнай вадой, а потым адсякалі па два пальцы на левай руцэ і назе, выколвалі левае вока... Але нядоўга цешыўся сваімі багаццямі гэты крыважэрца. У адну ноч, калі яны стаялі ля ракі ў чаканні купцоў з поўначы, тыя ж дазналіся пра гэта і

падгаварылі падняволеных разам з імі выступіць. Падняволеныя пагадзіліся і ўзялі з сабою косы, дубіны і калы.

Купцы прыпынілі свае лодкі з таварамі, падрыхтавалі плыты з гаручымі сумесямі і перад мытнай заставай запалілі, а самі незаўважана пакінулі іх.

У той жа час, калі ўладар назіраў за зіхатлівай з'явай на сваім участку ракі, купцы са слугамі і паднявольныя людзі накінуліся на яго, ахову і мытнікаў. У страшэннай бойцы засталіся знішчанымі і мытная застава, і мытнікі, і ўладар. Трупы былі складзены пасярэдзіне, абкладзены дровамі і спалены.

Каля дзесятка гадоў на гэтым папялішчы ніхто не сяліўся, а потым прыйшлі новыя людзі, пабудавалі сабе хаціны, засеялі зямлю, а ў памяць аб былым назвалі сваё месца МЫТО. *(Дадатак 21)*

*(Маліноўскі, М. Канец жорсткага ўладара // Лідская газета. -1998. - 22 жніўня.)*

## МЫТО

Многа паданняў існуе пра назву гэтай вёскі. Казалі, што некалі тут праязджала Кацярына ІІ. Каля ракі Дзітва яна вырашыла адпачыць. Імператрыцы вельмі спадабалася прыгажосць мясцовай прыроды. Пахадзіўшы па беразе ракі, яна не ўтрымалася, каб не дакрануцца рукамі да празрыстай вады. Апаласнуўшы рукі, Кацярына ІІ сказала: “Мыта”. Гэта і дало падставу для назвы вёскі.

*(Запісалі ад Нікіфаравай Таццяны Мікалаеўны (1966 г.н.), супрацоўніцы гісторыка-мастацкага музея)*

## ЦАЦКІ

Адзін багаты чалавек меў вельмі шмат зямлі. Была сярод яго ўладанняў як урадлівая глеба, так і не вельмі. Хапала і не апрацаванай зямелькі. Дык вось калі ягоны сын надумаў жаніцца, бацька гэты выбар не адобрыў. Таму і аддаў у спадчыну сыну землі, на якіх было шмат неапрацаваных палей, ды і мясцовасць была лясістая. Выдзяліў ён таксама і сялян, і пры гэтым сказаў: “Цацкайцеся як хочаце!”.

*(Запісалі ад Нікіфаравай Таццяны Мікалаеўны (1966 г.н.), супрацоўніцы гісторыка-мастацкага музея)*

## ЭЙТУНЫ

Раней людзей, якія пражывалі ў гэтым населеным пункце называлі тунамі. І калі, хто-небудзь да іх звяртаўся, то як, правіла, гаварыў: “Эй, туны”. Адсюль і пайшла назва паселішча – Эйтуны.

*(Запісалі ад Забела Анатоля Часлававіча (1964 г.н.), жыхара Ліды)*

## Пра паходжанне і назвы азёраў, рэк

### ВОЗЕРА НЕДАЛЁКА АД ВЁСКІ ПЕСКІ

У тыя часы, калі хрысціянства толькі пачынала распаўсюджвацца ў гэтых краях, на месцы возера стаяў не то шынок, не то тракцір. Менавіта сюды і зайшоў пагрэцца падарожны-манах. Ён сеў у вуглу, раскрыў Біблію і стаў чытаць. П’яныя наведвальнікі шынка сталі насміхацца з чужака, але манах, не звяртаючы ўвагі на насмешкі, павярнуўся да ўсіх тварам і стаў чытаць прадмову.

Нам вядомы лёс многіх першых хрысціян: большасць з іх загінула за сваю веру. Не пазбег гэтага лёсу і наш манах. Наведвальнікі шынка накінуліся на яго і сталі біць. Ужо паўмёртвы манах толькі і змог сказаць: “Хай за маю смерць разамкнецца зямля і паглыне ўсіх язычнікаў”. І толькі ён прагаварыў гэтыя словы, як раскрыліся зямныя недры, і шынок праваліўся ў бездань, а на яго месцы утварылася возера, на паверхні якога плаваў стол з раскрытай Бібліяй.

*(Будревич, В. Исторические тайны. Легенды о родном крае. // Оникс. – 1998. - № 4.)*

### ВЯЛІЧКАЎСКАЕ ВОЗЕРА

Даўным-даўно ля дарогі (цяпер шаша Ліда — Новагародак) стаяла вялікая вёска Вялічка. Людзі жылі ў ёй багата. Толькі на канцы вёскі ад дарогі жыла бедная ўдава з маленькімі дзецьмі.

Аднойчы ў вёску прыйшоў жабрак, стары сівы дзядок. Ён абышоў усе двары, але яму ніхто нават і скарынкі ў торбу не кінуў. Зайшоў дзед і да ўдавы. Ужо вечарэла, і дзядок папрасіўся нанач. Жанчына ласкава запрасіла старога сесці і дала павячэраць міску нішчымнай заціркі. На гэтую зацірку яна заварыла апошнюю жменю жытняй мукі. Жабрак застаўся начаваць.

Назаўтра жанчына ўстала і здзівілася: у хаце і ў каморы было многа хлеба і ўсяго іншага. А дзед ёй сказаў:

— Выйдзі, кабета, з хаты з дзецьмі і ідзі не агладаючыся, хоць што-небудзь і пачуеш. Як аглянешся то на месцы тваёй хаты вырасце груша.

Жанчына так і зрабіла. Толькі яна адышла за вёску, як пачула ззаду трэск, шум і енк людзей. Усё крышылася і ламалася. Вёска прапала, а на яе месцы ўтварылася возера, а замест хаты ўдавы на беразе возера стаяла груша. Жанчына павярнулася, хацела пайсці паглядзець, што здарылася, але тут жа пераўварылася ў камень.

На другі дзень людзі з суседніх вёсак бачылі, як з возера выплывалі аконныя рамы, дзверы і іншая хатняя дробязь. Людзі пачалі збіваць жэрдкі, каб памераць дно, то з вады чалавечы голас сказаў:

— Не мерай тычыною, бо памераеш галавою.

Усё ж такі самыя цікаўныя ўзялі доўгую вяроўку, прывязалі камень і апусцілі на дно. Дна не дасталі, а з вады пачуўся голас:

— Не мерай вяроўкаю, бо памераеш галоўкаю.

Адзін чалавек пры гэтым утапіўся, і яго як ні шукалі, не маглі знайсці, хоць возера было невялікае.

Цяпер на беразе Вялічкаўскага возера расце старая груша і ляжыць вялікі камень з адбіткам быццам бы рукі жанчыны. *(Дадатак 22)*

*(Легенды і паданні // складальнікі М.Я.Грынблат і А.І.Гурскі – 2-е выд., дап. і дапрац. – Мн.: Бел.навука, 2005. С.391-392)*

## КСЕНДЗОВА ВОЗЕРА

У тым месце, дзе сёння знаходзіцца лясное возера, раней стаяла хата ксендза. Гэты ксёндз служыў у двух касцёлах – у Сяльцы і Беліцы. Каб зручней было дабірацца на працу, прыкладна ў аднолькавай адлегласці ад гэтых вёсак сяляне і пабудавалі яму жыллё.

У сваім жыцці вельмі шмат грашыў гэты ксёндз: курыў, водку піў, часта маладых дзяўчат да сябе ў госці запрашаў. Колькі разоў сам сабе абяцаў не кідацца ў блуд, аднак стрымацца не мог. І вось аднойчы вырашыў Бог пакараць яго. На тым месцы дзе стаяў дом ксендза ўтварыўся катлаван, які паступова стаў запаўняцца вадой. Калі ў нядзелю прыхаджане не дачакаліся святара ў касцёле, то вырашылі праведаць яго. Ці не захварэў часам? Аднак калі прыйшлі на месца, то замест хаты ксендза ўбачылі невялікае возера. З тых самых часоў і сталі называць гэта возера Ксендзовым.

Гавораць, што ноччу калі на небе няма хмараў і ярка свеціць месяц на дне возера можна ўбачыць хатку святара. А некаторыя бачылі, што ў ёй гарыць агеньчык і нават прыадчынены дзверы. *(Дадатак 23)*

*(Запісалі ад Перцавай Вікторыі Васільеўны (1975 г.н.), супрацоўніцы турыстычнай фірмы “Святавіт”)*

## НЁМАН І ЛОША

Даўно-даўно, тысячы гадоў назад з-пад вялізнага каменя, дзе б’е крынічка, нарадзіўся славуты багатыр. Яго назвалі Нёманам. Жыў сярод лясоў дрымучых, лугоў

шырокіх. Прыгожы, працавіты. Прыродзе і людзям і ўсяму жывому дабром плаціў. Па суседству жыла Лоша. Лянівая, ляжала ў цяньку, сабою любавалася. Нікому ад яе не было ніколі ні радасці, ні карысці. Лоша часта заглядала да свайго суседа. За маўклівасць называла яго Неманцом.

Цяпер ніхто не ведае: за што Нёману прыглянулася такая красуня. Адно вядома, было вяселле. Гуляла на ім уся радня жаніха: і Сула, і Уса, і Уздзянка, і Шчара... Каго толькі тут не было! Пілі, балявалі, маладым шчасця ды добрай долі жадалі. Скончылася вяселле, пачаліся будні.

Зноў Нёман не ведаў ні дня, ні ночы. Паіў, карміў, туліў усіх, хто да яго гарнуўся: і чалавека, і звера, і птаха, і рыбу, і жыўнасць усякую. Цешыў сваёй люстэркай вод прыбярэжныя лясы, палеткі, лугі. На сваіх магутных грудзях насіў чоўны, ганяў плыты.

Не раз запрашаў на шырокі прастор і сваю красуню ненаглядную. Толькі тая заставалася абыякавай да ўсяго, халоднай па-ранейшаму, не хацела дзяліць са сваім багатыром яго нягоды і радасці.

Не па душы было такое жыццё Нёману. Аднойчы цёмнай ноччу кінуўся ўпрочкі. Стараўся замесці след: дзе пад поплавам прабяжыць, дзе для перадыху вынырне плёсам, тоней, азярцом, а затым зноў схаваецца. І толькі там, дзе цяпер Забалоцце стаіць, багатыр у адкрытую пайшоў да мора.

Прачнулася Лоша, а Нёмана няма. Пачала даганяць уцекача, ды не ў той бок кінулася. Па далінах ды нізінах бегла. Ажно сіл не ставала, ды й не ведала, куды далей падацца. Гукала-клікала на дапамогу, але ніхто не прыйшоў: ні Пціч, ні Бярэзіна, ні Свіслач... Толькі Выня паспачувала гору сваёй сяброўкі. Выбеглі яны ўдзвюх да груда пясчанага, дзе сягоння Пясочнае, і ўбачылі: Нёман праз долы і лясы дарогу сабе пракладае. Хвалямі горкіх слёз кінулася Лоша ў абдымкі да свайго багатыра: адчула, жыць па-ранейшаму ды яшчэ адной заставацца - няварта, зачахнуць можна. Пачала дапамагаць Нёману. З цягам часу і людзі не абмінулі яе стараною: паблізу пачалі будавацца. Так нарадзіліся вёскі Лоша, Мрочкі, Перавоз, Сасноўка, Рачыца, Пад’ельнікі, Пясочнае.

Нёман ніколі не забывае родныя мясціны. Кожную вясну, кожную восень дажджлівую вяртаецца да маці сваёй - крынічкі, якая цячэ з-пад вялізнага каменя, вяртаецца сюды, каб сустрэцца са сваёй Лошай, са сваёй маладосцю...

*(Легенды і паданні / [Склад. М.Я.Грынблат і А.І.Гурскі; рэд. Тома А.С.Фядосік]. – 2-е выд., дап. і дапрац. – Мн.: Бел. навука, 2005. С.385-386)*

ЯК НАРАДЗІЛІСЯ НЁМАН І ЛОША

Пра Нёман расказваюць так. Даўно гэта было. Каля дзярэўні Забалацце, што на нашай Уздзеншчыне, з-пад вярбы выбілася крынічка. Вада ў ёй была халодная, як лёд, а чыстая, як раса. Вада тая ўсё прыбывала, большала, аж пакуль не пабегла па двух ручаінах. Так вось нарадзіліся рэкі Нёман і Лоша.

Нёман быў шчыры і крэпкі хлапец, а Лоша ціхая, лянівая і хітраватая дзеўка. Яшчэ больш падужэўшы, Нёман аднойчы сказаў Лошы:

- Раздолля трэба мне, волі захацелася. Буду як мага прабівацца да мора.

Нічога не сказала на гэта Лоша, толькі сама сабе надумалася навыперадкі бегчы з Нёманам і першай выскачыць к мору.

Назаўтра, яшчэ не развіднела, яна ціхенька ўстала і бегла пабегла па нізінах ды па далінах да мора.

Прачнуўся Нёман, угледзеў, што Лошы няма, ну й кінуўся наўздагон, не разбіраючы дарогі, напрасткі.

З таго часу ён так і ляціць, паспяшае да мора, магутны і шырокі, а Лоша плыве ціха, хаваючыся ды туляючыся па кустах і нізінах.

*(Легенды і паданні / [Склад. М.Я.Грынблат і А.І.Гурскі; рэд. Тома А.С.Фядосік]. – 2-е выд., дап. і дапрац. – Мн.: Бел. навука, 2005. С.385)*

**Пра гістарычныя падзеі і гістарычныя асобы**

ДВАРЫШЧАНСКАЯ БАШНЯ – СВЕДКА ЖОРСТКАГА ЗАБОЙСТВА

У XIX ст. у Дворышчах на высокім халме стаяў чатырохпавярховы палац. Парадны фасад палаца злева і справа завяршаўся дзвюма башнямі: адна – трохпавярховая, другая - чатырохпавярховая. Верагодна, падчас Першай сусветнай вайны драўляны палац быў спалены. На сённяшні дзень ад былой магутнасці маёнтка засталася толькі чатырохпавярховая башня, з якой звязана смутная легенда-быль.

Апошнім уладальнікам гэтых мясцін быў Аўгуст Амберг. З прыходам Саветаў у 1939 годзе ён выехаў за мяжу. Гаварылі, што падчас нямецкай акупацыі, ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у Дворышча разам з мужам (панам Вазняком) і дзецьмі вярнулася дачка апошняга ўладальніка маёнтка. Напэўна, яна спадзявалася, што пры новым рэжыме ёй пашанцуе вярнуць былыя бацькоўскія ўладанні. Сям’я пасялілася ў башні.

У той час у Дворышчах было торфапрадпрыемства, на якім ахоўнікамі працавалі немцы. Пан Вазняк, напэўна, быў назначаны ўпраўляючым. Немцы прымушалі працаваць на прадпрыемстве нават у нядзелю і па святах. І вось аднойчы людзі

ўзбунтаваліся і не выйшлі на працу. Тады пан Вазняк і немцы сабралі каля дваццаці маладых хлопцаў і расстралялі іх. Хутчэй за ўсё, бацькі гэтых хлопцаў праз некаторы час адпомсцілі за смерць сваіх дзяцей. Уся сям'я пана Вазняка была расстраляна ў башні. Напэўна, гэтай расправе дапамагла прыслуга, якая ночай адчыніла дзверы башні. *(Дадатак 24)*

*(Запісалі ў Марцінкевіч Людмілы Уладзіславаўны (1959 г.н.), загадчыцы Дварышчанскай бібліятэкі)*

## ШВЕДСКАЯ ГАРА

У пойме ракі Дзітва, сярод балот і зараснікаў, узвышаецца высокі авальнай формы груд, які мясцовыя жыхары называюць Шведскай гарой. Паданне распавядае, што некалі ў час Паўночнай вайны, тут загінуў нейкі высокага чыну вайсковец і на гэтым месцы быў пахаваны. Паплечнікі і падначаленыя загінуўшага, нанеслі шапкамі на магілу столькі пяску, што на тым месцы вырас высокі насып. Хоць і рамантычнае паданне, аднак не можа быць праўдай. На самой справе, так званая Шведская гара – не што іншае, як прыроднае ўтварэнне. Тым не менш, назва трывала захавалася да нашых дзён. *(Дадатак 25)*

*(Запісалі ад Куляша Анатоля Фёдаравіча (1927 г.н.), лідскага краязнаўцы)*

## ЯК СЦЕРКАЎСКІ СОЛТЫС З БЕЛАРУСКАЙ СЯЛЯНСКАЙ ГРАМАДОЙ ЗМАГАЎСЯ

З 18 сакавіка 1921 года да верасня 1939 года вёска Сцеркава, што ў Бердаўскім сельсавеце ўваходзіла ў склад Польшчы. З тых часоў захавалася паданне як сцеркаўскі солтыс Station Станіслаў Цешка "змагаўся" супраць Беларускай сялянскай грамады.

Грамадоўцы паводле сваёй сацыялістычнай сутнасці на розныя рэвалюцыйныя святы ладзілі дэманстрацыі і хадзілі з чырвонымі сцягамі. Польскія ўлады патрабавалі ад солтысаў не дапускаць тых дэманстрацыяў. Цешка паступаў наступным чынам: "Гэта яны з голаду дэманструюць", - казаў ён, і ў Сцеркаве для дэманстрантаў накрывалі стол, ставілі паесці і, нават, выпіць. Пасля добрага пачастунку сацыялістычныя настроі ішлі на спад, дэманстранты згортвалі сцягі і расходзіліся па дамах.

*(Лідчына // Наша слова. – 2006. - 26 ліпеня.)*

## Пра цэрквы, касцёлы і іншыя святыні

### АБРАЗ БОЖАЙ МАЦІ Ў БЕЛАГРУДСКІМ КАСЦЁЛЕ

Некалькі стагоддзяў таму назад, у адзін з цёплых летніх дзён, мясцовы пастух заўважыў, што да берага ракі Дзітвы прыбіўся абраз. На ім была выява Божай Маці. Пастух расказаў аб здарэнні жыхарам суседніх вёсак і паказаў абраз. Усе вырашылі, што нездарма адбылася гэта падзея, напэўна месца тут святое, таму і пастанавілі пабудаваць касцёл. Праз некалькі дзён закіпела каля ракі праца. Калі ж касцёл быў пабудаваны, паступова каля яго пачалі сяліцца людзі. Так і ўзнікла вёска Белагруда. А той абраз, які знайшоў на беразе ракі пастух, да сёняшняга дня знаходзіцца ў гэтым касцёле. *(Дадатак 26)*

*(Запісалі ад прыхажанкі Белагрудскага касцёла)*

### АБРАЗ У МЫТО

1893 год стаў для царквы вёскі Мыто Лідскага павета выдатным, бо ў гэты год быў выраблены выдатны Кіёт да старадаўняга вобразу Божай Маці, названай у простым народзе Калыханкаўскай. Разрозненыя звесткі пра іх сабраў святар Мытскай царквы святар Канстанцін Савіч і змясціў іх на старонках «Літоўскіх епархіяльных Ведамасцяў». Згодна з паданнем, якое існуе ў парафіі, Маці Божая з'явілася на вадзе і прыплыла па рацэ Дзітва да таго месца, дзе знаходзілася маёнтак Мыто. Як населены пункт Мыто было вядома з XV стагоддзя. Яшчэ ў 1415 годзе польскі кароль Уладзіслаў Ягайла на шляху з Кобрына ў Ваўкавыск, адпачываў тут некалькі дзён. Ужо тады Мыто было пунктам, дзе спаганяецца з праезджых купцоў падаткі. (Мыто - грашовы збор за ўвоз тавара праз мяжу. - В.Ч.). Калі ікона плыла па рацэ, то яна ўвесь час як бы калыхалася (Качалася), імкнучыся звярнуць на сябе ўвагу людзей, адсюль яна і атрымала ў народзе назву “Калыханкаўскай”. Падчас свайга плавання, адзін пастух з берага стукнуў па ёй бізуном, з-за чаго на твары яе з'явіліся два крывавых плямы, якія засталіся на ім назаўсёды. Пасля з'явы Божай Маці Калыханкаўскай у маёнтку Мыто была пабудавана драўляная царква, у якой і быў змешчаны з'яўлены вобраз Божай Маці. Пра існаванне царквы ў маёнтку па расказах сваіх дзядоў і прадзедаў мясцовыя вернікі ведалі. Наяўнасць яе пацвердзіў і такі факт. Калі ўладальнік маёнтка Мыто І.І.Чапялеўскі пажадаў развесці сад паблізу таго месца, дзе быццам бы калісьці стаяла драўляная царква, то пры раскопцы ям, пад дрэвамі людзі знаходзілі чалавечыя косткі. Відавочна, пры царкве знаходзіліся могілкі.

З маёнтка Мыто пасля царква была перанесена на адлегласць двух вёрст у сяло Мыто. Сюды ж хросным ходам быў перамешчаны і святы вобраз Божай Маці, які

змясцілі ў алтары, дзе ён і знаходзіўся да закрыцця ў вёсцы старой драўлянай царквы. Пасля закрыцця старой царквы ў вёсцы Мыто каля дзесяці гадоў не было святара, а прыходам загадваў суседні святар з вёскі Радзівонішкі, то па ўсеагульным рашэнню вобраз Божай Маці Калыханкаўскай быў перанесены ў вёску Радзівонішкі.

Старажылы распавядалі, што калі гэты абраз хацелі перанесці ў сяло Радзівонішкі, то Божая Маці была незадаволена гэтай акалічнасцю і сляды збянтэжанасці на яе твары былі заўважаны некаторымі вернікамі. І толькі пасля стараннай малітвы народнай, Божая Маці зрабіла ласку перанесці свой вобраз на новае месца да часу пабудовы ў вёсцы Мыто новай царквы. Калі ж новая каменная царква тут была пабудавана, то вобраз Божай Маці Калыханкаўскай быў пастаўлены ў ёй у кутку ля левага кліраса, у месцы цесным і нязручным. Акрамя ўсяго, за доўгі час свайго існавання абраз вонкава вельмі знасіліся. І тады парафіяне выказалі дбайнае жаданне да ахвяраванняў на аднаўленне і пазалоту рамы гэтага абраза, не дакранаючыся выпраўлення самога аблічча. Каля года збіралі грошы на рэстаўрацыю і калі назапасілі 120 рублёў, на гэтыя сродкі віленскі майстар Зімодро не толькі абнавіў вобраз Божай Маці, але і зладзіў да яго прыстойны Кіёт, які быў пастаўлены на бачнае месца.

Некалькі слоў пра знешні выгляд гэтага святога ладу. У старажытным вопісу царкоўнай маёмасці запісана наступнае: «Вышыня выявы без рам 5 вяршкоў, шырыня 3 з паловай вяршкі, пісаны на палатне ў драўляных рамах, пакрытых золатам, рыза сярэбраная, звонку пазалочаная золатам 12 пробы і вагой 35 залатнікоў, над галавой 2 кароны, абедзве серебрянные золатам 8 пробы, 1 - 10 залатнікоў, а 2 - 5 залатнікоў вагой».

Дабрадатная і цудатворная сіла ад гэтага святога абразу прыцягвала да яго народ з усіх навакольляў. Хрысціяне моцна верылі ў цудадзейную сілу гэтага вобразу і ў дні смутку нярэдка атрымлівалі тое, што прасілі. Па некаторых сведчаннях, калі ў 1870-х гадах у некаторых вёсках прыходу лютавала халера, народ успомніў пра яе, і пасля стараннай малітвы эпідэмія спынілася, а ў самім сяле Мыто не было ніводнага выпадку гэтага захворвання. Прыватных жа выпадкаў збавення вернікаў ад розных бед і нясчасцяў па малітвах перад чынам Божай Маці Калыханкаўскай было таксама нямала, і такія выпадкі захоўваюцца ў сэрцах ашчаслiўленых людзей. На жаль, сёння лёс гэтай выявы нам невядомы.

*(Черепица, В.Н. Очерки истории Православной Церкви на Гродненщине (с древнейших времён до наших дней). Монография: часть II. – Гродно: ГрГУ, 1995. – 440 с.)*

## АБЯРЭГІ АД ХВАРОБЫ

Некалі, я тады была яшчэ дзіцем, маці расказывала, што ў вёсцы Паперня некая хвароба хадзіла. І ад яе многія людзі паміралі. Тады нехта падказаў, як можна гэтую хваробу спыніць. Трэба было за адну ноч напрасці нітак і выткаць тры ручнікі. Таксама неабходна было паставіць тры крыжы. Дык вось усе жанчыны пралі і ткалі, а мужчыны крыжы рабілі. Затым паставілі крыжы пасярэдзіне вёскі і на кожны павесілі ручнік. Хвароба і адышла. Тыя крыжы доўга стаялі, пакуль бальшавікі не прыйшлі.

*(Запісалі ад Вадэйкі Марыі Пятроўны (1936 г.н.) з в.Рулевічы)*

## КАМЕНЬ-СЛЕДАВІК У БАБРАХ

У вёсцы Бабры жылі людзі. Але там не было ні царквы, ні касцёла, таму жыхарам не было дзе памаліцца. Аднойчы ноччу аднаму мужчыну з вёскі прысніўся сон. У ім ён убачыў жанчыну з дзіцем, якая яму сказала: “На тым месце дзе я стаю, павінна быць пабудавана царква”. Раніцай, вырашыў той мужчына знайсці месца, якое бачыў ў сне. Падыходзячы да гэтага месца ён убачыў жаночую цень. Мужчына падбег, але цень знікла. На тым месцы убачыў ён вялікі камень, а на ім два следа. Адзін большы – напэўна Маці Божай, другі меньшы – Іісуса Хрыста. Аб сваёй знаходцы і цудоўным сне расказаў мужчына сваім аднавяскоўцам. Парадзіліся людзі і вырашылі каля камня пабудаваць драўляную царкву, а сам камень абгарадзіць і берагчы як сімвал і талісман. *(Дадатак 27)*

*(Запісалі ад Івана (1934 г.н.) і Марыі (1937 г.н.) Гагалушка з вёскі Бабры)*

## КАПЛІЦА Ў ЦВЕРМАХ

Згодна паданню, каля вёскі Цвермы ў голым полі расла сасна. Каля яе праходзіла дарога, якая злучала дзве вёскі – Цвермы і Дворышча. Аднойчы па гэтай дарозе ішла жанчына з нямым дзіцем. Раптоўна пачалася навальніца і жанчына вырашыла схавацца пад сасной. Падчас навальніцы маланка стрэліла ў гэтае адзінае дрэва. Хлопчык вельмі спалохаўся, што нават выкрыкнуў слова: “Мама!”. Жанчына ад радасці падняла вочы да неба, каб выказаць падзяку Богу, і ўбачыла, што яна стаіць не пад зусім звычайным дрэвам. Калі ў звычайнай сасны галінкі апускаюцца ўніз, то галінкі гэтага дрэва былі ўсе перакручаны. Быццам дрэва перажыло якое-небудзь гора, шмат пакутвала.

Жанчына расказала гэту гісторыю сваім аднавяскоўцам. Яны вырашылі ўшанаваць месца і паставілі там драўляны крыж. Сюды пачалося паломніцтва. Дзяўчаты вешалі на галінкі дрэва вышываныя ручнікі, паяскі, загадвалі пажаданні, звярталіся з просьбамі. Многія людзі вылечваліся каля гэтага крыжа. Мясцовыя

жыхары адносіліся да крыжа з асаблівай павагай. Таму, калі з цягам часу, дрэва, з якога быў ён выраблены, стала рассыпацца, вернікі як вялікую рэліквію бралі шчэпкі яго і неслі дамоў. А жыхар Цвермаў Стэфан Валяль разам з жонкай Марыянай паставіў новы крыж і змясціў на ім фігуру Збавіцеля. З цягам часу тут пабудавалі драўляную капліцу.

У 50 – 60-я гады XX ст., у часы атэістычнай прапаганды, у вёску прыехаў нейкі начальнік і загадаў знішчыць капліцу. У адзін з дзён да яе быў падагнаны саўгасны трактар з Дворышчаў. Трактарыст, якому было вытлумачана: капліцу патрэбна знішчыць, - каб не рабіць гэтага, наўмысна пашкодзіў трактар. Тады быў выкліканы саўгасны механік, які адрамантаваў тэхніку, і нялюдская справа была здзейснена. З каплічкі дазволена было вынесці толькі крыж, які вернікі аднеслі ў Тракельскі касцёл. Страпілы ад капліцы перавезлі ў Дворышча і выкарысталі для даху на сенавале. Праз тыдзень будынак разваліўся. Камені з фундамента капліцы перавезлі на ферму. Тыя людзі, якім прыходзілася рамантаваць гэты будынак, ці паміралі, ці цяжка хварэлі.

На жаль, вялізнае дрэва з часам спасціг такі ж лёс, як і капліцу. Сасну спілавалі, і мясцовыя жыхары доўга ўзгадвалі пра тое, што па колеру смала яе нагадвала кроў. Таму ні ў каго не паднялася рука, каб распілаваць ляжачае дрэва, і сёння разгалістыя сухія галіны яго нагадваюць людзям пра даўнія падзеі.

У 2007 годзе на сродкі вернікаў-фундатараў каля сасны была пабудавана новая каплічка і на Радуніцу асвечана. З Тракеляў была вернута рэлігійная святыня – Крыж з выявай Ісуса Хрыста.

З'яўленню новай капліцы папярэднічала наступная гісторыя. Адзін малады чалавек, які жыве ў Лідзе, але карані яго з Дрорышчаў, прысніў сон. Быццам ён прыехаў на тое месца, дзе ляжала сасна. Падняў галінку дрэва, а адтуль выпаўзла змяя, якая гатова была яго ўкусіць. Аднак чыйсці голас быццам паралізаваў змяю і звярнуўся да мужчыны з прапановай: "Прыедзь на гэта месца і пастаў крыж". Мужчына не звярнуў ніякай увагі на гэты сон. Аднак праз некаторы час, калі ён цяжка захварэў, на розум прыйшлі словы са сна. Чалавек ён быў веруючы, таму разам з жонкай вырашылі паставіць крыж каля сасны. Яны зрабілі металічны крыж, асвяцілі яго і адвезлі на тое месца. Не прыйшлося нават ямы капаць, каб замацаваць крыж, таму што ў зямлі была спецыяльная адтуліна. Магчыма гэта вельмі здзівіла мужчыну, таму і вырашыў ён адбудаваць тут капліцу. І дапамаглі яму ў гэтым яго сябры. *(Дадатак 28)*

*(Запісалі ад Марцінкевіч Людмілы Уладзіславаўны (1959 г.н.), загадчыцы Дварышчанскай бібліятэкі)*

## КАПЛІЧКА ЛЯ ЦВЕРМАЎ

Жыў некалі ў Цвермах чалавек па прозвішчу Жак. Аднаго разу араў ён поле і знайшоў там крыж. Узяў яго селянін і прынёс дадому. Маўляў, прымацую яго дзе-небудзь. Аднак за працаю часу на гэта не знаходзіў. Прайшло тры дні, і ўся сям'я вяскоўца пачала траціць зрок. Заспяшаўся Жак да святара расказаць аб сваёй бядзе, а той і кажа яму: "Адхіліся ад работы, знайдзі час устанавіць крыж на тым месцы, дзе выараў яго з зямлі". Так селянін і зрабіў. І зрок да членаў яго сям'і вярнуўся.

З таго часу да крыжа ішоў пакланіцца мясцовы люд. З гадамі поле, на якім араў Жак, зацягнулася лесам, а ўстаноўлены крыж, паколькі быў драўляным, пачаў сыпацца на трэсачкі. Іх людзі бралі як рэліквію і неслі дадому. Тады прадоўжыў справу свайго аднавяскоўца Стэфан Валяль: паставіў на святым для вернікаў месцы новы крыж з фігуркай Хрыста.

Ужо ў дваццатым стагоддзі, а дакладней, у 1935 годзе, ксёндз лідскага Фарнага касцёла Баярунец разам з парафіянамі вырашыў пабудаваць тут каплічку. Прыгожае, велічнае збудаванне было асвенчана. Пачалі праводзіцца імшы. Старажылы памятаюць, што, напрыклад, на імшу, якая стала традыцыйнай на другі дзень каталіцкага свята Заслання Духа Святога, збіралася да паўтара дзесятка тысяч чалавек.

У 60-х гадах, калі пачалася антырэлігійная кампанія, быў дадзены загад зруйнаваць каплічку, прыпыніць пакланенне святыні. Па расказах, хоць і баяліся вяскоўцы тады пярэчыць рашэнням, прынятым наверсе, ды ўсё ж некаторыя кінуліся на абарону святога месца. "Людзі, бярыцеся за рукі, станавіцеся сцяной, не дадзім каплічцы загінуць!" — клікала на абарону збудавання тых, хто прыбег сюды, старэнькая бабуля. Ды дзе ж можна было спыніць тэхніку - трактар, які прыгналі, каб разбурыць пабудову?! Удар, яшчэ адзін... І нібы надломленая болем, упала на зямлю каплічка.

Праўда, вясковец з Цвермаў Станіслаў Бепка змог-такі ўратаваць некаторыя фігуры святых, крыж, што былі ў самой капліцы. Іх потым перадалі ў Тракельскі касцёл.

З цягам часу лягла на зямлю і вялікая сасна, якая расла на гэтым святым месцы. А вось ужо пілаваць яе на кавалкі ні ў каго рука не паднялася, паколькі казалі, што тыя, хто меў такую спробу, бачылі на камялі крывавыя слёзы...

Адраджэнне святога месца адбылося гадоў пяць назад. Пачалося з таго, што жыхар вёскі Гімбуты Капачэль прысніў сон, у якім яму прыбачылася, што паратунак ад сваіх недамаганняў знойдзе толькі тады, калі зоймецца аднаўленнем разбуранай капліцы ля Цвермаў. Першае, што зрабіў гэты чалавек, - паставіў на тым месцы

жалезны крыж. І зноў жа людзі казалі, што пэўнага кавалачка зямлі, дзе б мог замацаваць крыж, ён доўга не мог знайсці. І раптам - знайшлося такое месца. Атрыбут веры лёгка ўвайшоў у глебу.

Пазней на сродкі вернікаў-фундатараў была пабудавана і новая каплічка. Яе асвяцілі ў чэрвені 2007 года. І зноў, як у тыя далёкія часы, пачалі кожны год ладзіцца імшы ды свята. Але шматлікія вернікі збіраюцца не толькі на яго. Прыязджаюць сюды людзі кожны дзень. У думках услаўляючы Усявышняга, просяць яны парады і дапамогі ў жыцці і справах. І просьбы іх не застаюцца непачутымі".

*(Петрулевіч, Л. Каплічка ля Цвермаў. // Лідская газета. - 2010. - 12 жніўня.)*

## СВЯТАЯ КРЫНІЦА НА КАЦЯРЫНІНСКІМ ТРАКЦЕ

Вёска Лебяда Лідскага раёна вядома сваім Свята-Нікольскім храмам. На працягу амаль 100 гадоў ён з'яўляецца яе ўпрыгажэннем.

Каля гэтай вёскі, на былым Кацярынінскім тракце, знаходзіцца святая крыніца, вада ў якой была асвечана 9 кастрычніка 2008 годзе ў горар апостала-евангеліста Яна Багаслова.

Сама крыніца была знайдзена, яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў назад, калі настаяцелем храма быў Леанід Жак. Дадзенай знаходцы папярэднічала наступная гісторыя.

Адной жанчыне, якая жыла вельмі далёка ад гэтых мясцін, прысніўся сон, у якім яна ўбачыла жыватворную крыніцу каля храма. Жанчына накіравалася ў падарожжа, каб знайсці крыніцу. Яе надзея спраўдзілася. Крыніцу знайшлі і пачалі упарадкоўваць. Аднак з цягам часу поле, дзе яна знаходзялася зааралі, а падыходы да яе зараслі бур'янам.

І толькі праз некаторы час, ўжо ў XXI ст., намаганнямі царквы і прыхаджан, а таксама саўгаса "Мажэйкава" крыніца была ўпарадкавана. Гэта святое месца прыхаджане аберагаюць як свяшчэнны дар. На сёняшні дзень падобны цуд адзіны на тэрыторыі Лідскага раёна.

Вада ў крыніцы валодае гаючай сілай. Негледзячы на тое, что святыня знаходзіцца каля калгаснага поля і ў глебу пастаянна ўносяцца ўгнаенні, аналіз вады паказвае, я што яна абсалютна чыстая. *(Дадатак 29)*

*(Запісалі ад Мікалая Ахотніцкага (1964 г.н.), настаяцеля Свята-Нікольскага храма в. Лебяда Лідскага раёна)*

## ФАМІЛЬНАЯ ЎСЫПАЛЬНІЦА МАЎРАСАЎ У ТАРНОВА

На адкрытай хвалістай раўніне, сярод палёў, квяцістых лугоў ды сенакосаў, прытуліўшыся да правага берага ракі Дзітва, раскінулася вёска Тарнова. У XVII – XVIII стст. паселішча называлася Тарноўшчына, ад імя графа Пятра Тарноўскага.

За мінуўшыя стагоддзі паселішча змяніла шмат уладальнікаў. Аднак самы значны след у гісторыі гэтых мясцін заставіў палкоўнік рускай арміі Зміцер Маўрас, які купіў гэтыя землі 25 мая 1866 года.

Пасля выхада на пенсію ў годнасці генерал-лэйтэнанта і атрымаўшы тытул графа, у канцы 70-х гадоў Зміцер Маўрас распачынае ў Тарнова шырокія будаўнічыя работы.

Да сярэдзіны 80-х гг. новы гаспадар пабудаваў двухпавярховы палац, ветравы млын, стайню, лядоўню, якія захаваліся да нашых дзён і з'яўляюцца архітэктурнымі помнікамі XIX ст. Тарноўскія землі сталі родавым маёнткам сям'і Маўрасаў.

У красавіку 1890 г. калі памерла жонка графа, Зміцер Маўрас вырашыў увекавечыць памяць аб ёй - пабудаваць храм. 8 кастрычніка 1892 г. святар Радзівонішкаўскай царквы А.С. Дружылоўскі ў маёнтку асвяціў капліцу ў імя Святога Зміцера Салунскага. Капліца ўяўляла сабой мураваны будынак у гатычным стылі. Аконныя шыбы былі ўпрыгожаны святымі выявамі і крыжамі з рознакаляровага шкла. Унутраннае аздабленне капліцы вызначалася багатай маёмасцю, каштоўным посудам і строгім царкоўным жывапісам. Была зроблена званніца ў прыгожай трохяруснай калоне, увенчанай конусападобным купалам з крыжам наверсе. Пад капліцай была зроблена фамільная ўсыпальніца, дзе знаходзіліся мошчы жонкі храмастваральніка. Хадзілі чуткі, што Кацярына Маўрас ляжала забальзамаваная ў спіртавым растворы. У гэтай жа ўсыпальніцы праз 4 гады быў пахаваны і сам граф Зміцер Маўрас. *(Дадатак 30)*

*(Сліўкін, В. Тарнова. // Лідскі летапісец. – 2005. - №1-2.)*

## ФІГУРКА ІІСУСА ХРЫСТА НА СТАРЫХ МОГІЛКАХ У ДВОРЫШЧАХ

На старых могілках у Дворышчах, на месцы колішняй капліцы Маці Божай Ружанцовай сёння стаіць фігурка Іісуса Хрыста. Адкуль яна тут з'явілася і дзе была раней дакладна невядома. А чаму з'явілася, ведае кожны. Справа ў тым, што нейкія напасці праследвалі жыхароў саўгаса "Ніва", то дождж, то град, то неўраджай. Параіліся людзі з дырэктарам саўгаса і вырашылі, што павінен у іх быць нейкі абярэг. Таму і вырашылі прывезці сюды фігурку Іісуса Хрыста. Гавораць, што з ёй падчас вайны адбылася дзіўная гісторыя. У тыя часы стаяла гэта фігурка каля дарогі. Аднаго

дня праходзіў там абоз з нашымі салдатамі. І вось двое маладых вайскоўцаў вырашылі пастраляць па статуе. Праз некалькі хвілін прыляцеў нямецкі самалёт, які градам куль накрыў увесь абоз. Але ўсе салдаты засталіся ў жывых, акрамя тых дзвух, якія стралялі па фігурцы. Гавораць, што нават і сёння можна ўбачыць на статуі сляды ад куль.

Некаторы час фігурка Іісуса Хрыста стаяла на старых могілках нічым не пакрытая зверху і толькі пасля таго, як над ёй надбудавалі невялікі дах, справы ў саўгасе пачалі ісці ўгару. *(Дадатак 24)*

*(Запісалі ад Марцінкевіч Людмілы Уладзіславаўны (1959 г.н.), загадчыцы Дварышчанскай бібліятэкі)*

## ЦАРКВА Ў ДЗІКУШКАХ

У вёсцы Дзікушкі ў 1840 годзе ў стылі позняга класіцызму была пабудавана ўніяцкая царква. Пазней яна стала праваслаўнай. Падчас усталявання савецкай улады на беларускіх землях, царква была зачынена, а ў яе будынку арганізавалі склад. Жыхары заўважылі, што адна сцяна, не вытрамаўшы здзекаў над святыняй, утварыла адтуліну. Яна была такой вялікай, што нават дзіцё магло пралезці.

У 1990-я гады ўлады вярнулі будынак праваслаўнай царкве. Калі царкву асвяцілі і правялі першую службу, адтуліна амаль знікла, заставіўшы толькі невялікі знак на сцяне, як напамін аб сваім нялёгкім лёсе. *(Дадатак 31)*

*(Запісалі ад пратаірэя Сергія Шафароста (1962 г.н.), настаяцеля Свята-Міхайлаўскага сабора ў г. Лідзе)*

## ЦУДОЎНЫ СКАРБ У ЗБЛЯНАХ

У вёсцы Збляны жыла жанчына, якая верыла снам і ўмела іх тлумачыць.

Аднойчы яна прысніла, што пад высокай елкай, якая расце пры дарозе, знаходзіцца скарб. Прачнуўшыся, жанчына папрасіла, каб мужыкі раскапалі зямлю пад той самай елкай, якую яна прысніла. Мужчыны згадзіліся. Якім жа было здзіўленне, калі ў хуткім часе яны ўбачылі нешта шэрае і вялікае! Гэтым скарбам аказаўся вялізны камень. Аднак быў ён не зусім звычайны. Валун быў плоскі, ды такі гладкі, быццам адпаліраваны, а ў вугалочку – выява стылізаванага праваслаўнага крыжа, памерам прыкладна каля 25 – 30 см.

Здзівіліся людзі, але так і заставілі гэты камень ляжаць пад дрэвам. Летам, калі сонейка награвала яго, на камень любілі прысесьці і пагуляць мясцовыя хлопчыкі і дзяўчынкі. Дарослыя ж прывыклі да гэтай знаходкі і амаль не заўважалі.

Кажуць, што ў 50-я гады XX стагоддзя камень забрала ў музей адна з навуковых экспедыцый, і дзе цудоўная знаходка сёння - дакладна невядома.

*(Запісалі ад Куляша Анатоля Фёдаравіча (1927 г.н.), лідскага краязнаўцы)*

### ЧОРТАЎ ЗАПАЛЬНІК І БОЖЫ ТУШЫЛЬНІК

А гэтая гісторыя адбылася ў вёсцы Калясішча Лідскага раёна ў сям'і бацькавай сястры... Была вялікая навальніца, блішчала маланка. І раптоўна ў хаце штосьці засвяціла. Праз аконную фортку ўляцеў вогненны клубок і пачаў знішчаць полымем фіранкі. А за гэтай шарападобнай з'явай следам рухаўся такі ж самы клубок які ўжо толькі тушыў з'явіўшаеся полымя. Усё адбылося так хутка, што і разгубіцца не паспелі.

*(Хітрун, А. Беларускі народны эпас Лідчыны: матывы і вобразы // Лідскі летапісец. – 2010. - № 3 (51).)*

## **Пра праявы злых (цёмных) сіл**

### ВЯДЗЬМАРСКАЕ НАКЛЯЦЦЕ

Пайшлі аднойчы муж з жонкай да адной бабкі – шаптухі. Тая ім кінула на карты, якія прадсказалі будучае кліентам. Пасля бабка ім кажа што на іх накінуты негатыў, накляцце кімсьці з жыхароў вёскі. Пасля яна дабавіла, што калі ў хаце ёсць жабы, то ўзяць і адсекчы ёй лапу. А ад гэтага метаду можна даведацца, хто ў вёсцы вядзьмар ці ведзьма ўбачыўшы ці пачуўшы пасля: хто ў гэты дзень атрымаў цяжкую траўму канечнасці.

Так і зрабілі. Знайшлі ў хаце жабу (якая даўно прыжылася ў хатнім памяшканні), адсеклі ёй лапу. А назаўтра і даведаліся, што ў вёсцы адна жанчына паламала сабе руку.

*(Хітрун, А. Беларускі народны эпас Лідчыны: матывы і вобразы // Лідскі летапісец. – 2010. - № 3 (51).)*

### САТАНА ГАВОРЫЦЬ У ДЗЯЎЧЫНЕ

Гэтая падзея адбылася ў 1935 годзе ў вёсцы Яманты з Карабач Аляксандрай. Аднойчы раніцай дзяўчына зачэрпала ў студні ваду і несла цераз вуліцу дамоў. Да яе падышоў Вінцук Карабач, шлёпнуў яе па плячу і сказаў: "Во ранняя дзяўчына, ужо і ваду нясе!". Напэўна ад нечаканасці Аляксандра спалохалася і пасля гэтых падзей расхварэлася. Яе хвароба была не зусім звычайная: пасяліўся ў дзяўчыне сатана. Бывала скрывіць Аляксандра ніжнюю чэлюсць і загаворыць мужчынскім голасам. Колькі па дактарах ні вазілі, ніхто дапамагчы не мог. Раз сатана гаварыць умее,

вырашылі аднавяскоўцы прывесці бацюшку. Можа ён памоліцца і паможа выгнаць сатану. Бацюшка маліўся, маліўся, але цуда не адбылося. Прывялі тады да дзяўчыны ксендза, але і яго малітвы не дапамаглі. Аднойчы скрывіла Аляксандра ніжнюю чэлюсць і загаварыў сатана мужчынскім голасам: "Надаелі вы мне сваімі бацюшкамі і ксендзамі. Толькі Нарбут мяне можа выгнаць. А той, хто паедзе да Нарбута, хай без загаворанага хлеба ад яго не выходзіць, нават тады калі гаспадар праганяць будзе." Вырашылі аднавяскоўцы прыслухацца да слоў сатаны, тым больш што ўсе ў ваколіцах добра ведалі Нарбута з Радзівонішкаў, як моцнага белага і чорнага мага. Д'яблы папярэдзілі Нарбута, што прыйдзе да яго чалавек прасіць загавораны хлеб, каб дапамагчы дзяўчыне, і той не адразу згадзіўся аддаць святы хлеб. Але чалавек, які да яго паехаў, не выйшаў з хаты мага, покуль не атрымаў таго, за чым прыехаў. Як толькі з'ела Аляксандра той хлеб, адразу сатана з яе і выйшаў. Потым выйшла дзяўчына замуж, а пазней яшчэ і сына нарадзіла.

*(Запісалі ад Карэйвы Вацлава Сцяпанавіча (1934 г.н.) з в.Мохавічы)*

**Пра сацыяльныя і сямейна-бытавыя адносіны**

"КЛЭЎСЯЎ КУТ"

У былыя часы сяляне вельмі беражліва, бы да той жывой істоты, адносіліся да зямлі. Яе ахоўвалі як толькі маглі. Стараліся карысней спажыць яе. Кожны кавалачак агароджвалі ад патравы хатняй ці дзікай жывёлай.

І вось адзін жыхар вёскі Збляны, па мянушцы Клэўсь, адгарадзіў свой кавалачак сенакосу калючым дротам. Пры гэтым паміж старанамі агароджы ўтварыўся вугал. Гэты вугал вяскоўцы празвалі "клэўсяў кут".

*(Кулеш, А. Сенчыкава разорка // Лідская газета. – 2006. - 31 студзеня.)*

"КУМАЎІНАЯ ЯМА"

Недалёка ад Ваверкі, прыкладна ў сямі кіламетрах, знаходзіцца вёска Рулевічы. Свайго касцёлу там ніколі не было, таму жыхары вымушаны былі наведваць Ваверскі касцёл. Менавіта там хрысцілі дзяцей, бралі шлюб.

Самай кароткай дарогай паміж гэтымі вёскамі была дарога праз лес-маладнічок. Побач з ёй, у лесе, ёсць глыбокая яма, якую людзі празвалі кумаўінай. Менавіта пра яе і расказваюць людзі гэтую гісторыю.

Аднойчы па лясной дарозе ў запрэжаным возе накіраваліся ў Ваверскі касцёл юнак і дзяўчына, каб ахрысціць маленькае дзіця.

Калі вярталіся назад, дзіця заснула. Ласкава прыпякала сонейка, шчабяталі птушкі, і лес вабіў сваёй прыгажосцю. Не ўтрымаліся маладыя кумы ад спакусы і звярнулі з дарогі ў лес, каб аддацца граху. У гэты ж час дрэвы растуціліся, а зямля разам з возам, канём і людзьмі правалілася. Засталася толькі яма.

Хто ведае гэту гісторыю, той і зараз абыходзіць гэта месца, баючыся пакарання за грахі. Кажуць, што ў яме і паблізу ад яе нават грыбы не растуць.

*(Запісалі ад Вадэйкі Марыі Пятроўны (1936 г.н.) з в.Рулевічы)*

## НЯМА ГОРШАЙ КАРЫ, ЯК У ПРЫМАХ

Даўным-даўно ў вёску папаўся па няшчасці воўк. Людзі яго злавілі і думаюць, якую яму даць кару. Адзін кажа - лапу адсекчы, другі кажа - вока выкалаць, трэці - хвост адсекчы.

У той вёсцы жыў прымак і, прышоўшы да людзей, ён сказаў:

- Ніякай кары яму не даваць, а ў прымічы яго аддаць.

З таго часу людзі прызналі, што няма горшай кары, як у прымах.

*(Легенды і паданні // складальнікі М.Я.Грынблат і А.І.Гурскі – 2-е выд., дап. і дапрац. – Мн.: Бел.навука, 2005.)*

## “НУ, КАЗЛОЎСКІ! Я Ж НЕ СПАДЗЯВАЎСЯ!”

Прыкладна ў сярэдзіне XIX ст. у Лідскім павеце жыў нейкі пан па прозвішчу Казлоўскі. Чалавек ён быў вельмі жадны і сварлівы. З якім часта судзіліся сяляне і, вядома, заўсёды прайгравалі.

Але тут знайшоўся адзін вельмі дападны селянін, які ўсё ж трохі нагнаў страху на гэтага Казлоўскага. Аднаго разу прабадзяўшыся дзесьці пару тыдняў, ён пусціў пагалоску, што быў у Пяцярбургу, і цяпер пра ўсе штукарствы Казлоўскага ведае сам цар. І нібыта той, пахістаўшы абуральна галавой, сказаў: “Ну, Казлоўскі! Я ж не спадзяваўся!”

З таго часу гэтыя словы сталі вельмі распаўсюджанымі на Лідскай зямлі. Як толькі надарыцца нейкае нечаканае ашуканства ці махлярства асабліва ад таго, ад каго яно не чакалася, то скрозь можна было пачуць: “Ну, Казлоўскі! Я ж не спадзяваўся!” Давялося пачуць гэтыя слову і вядомаму беларускаму паэту Францішку Багушэвічу. Ён запісаў выраз як прымаўку, як крылатыя словы, даследаваў іх вытокі, вызначыў, што свой пачатак яны бяруць з 1850 года, і радзіма іх - Лідчына.

*(Содаль, У. “... Сем раз Ліду ён адведаў” // Лідская газета. – 2007. - 14 ліпеня.)*

“СЕНЧЫКАВА РАЗОРКА”

Рака Нёман для жыхароў вёскі Збляны спакон вякоў значыла вельмі шмат. Яна была для іх і абаронцам, і памочнікам, і карміцелькай. Дык вось, у вёсцы жыў чалавек па мянушцы Сенчык, сапраўднае імя - Сямён. Кожную раніцу ён прыходзіў на адно і тое ж месца на беразе Нёмана і вудзіў яршоў. У вёсцы лічылася, што самая смачная юшка бывае толькі з яршоў. Хоць рыбка гэтая невялічкая і вельмі калючая, Сенчык лавіў яе з задавальненнем. Месца тут, закрытае гарою ды хмызнякамі, было ціхае, цячэнне ракі павольнае.

Больш маладыя ды спрытныя рыбакі пасмейваліся і кпілі са старога. І нехта з вострых на язык вазьмі ды назаві гэтае месца Нёмана “Сенчыкавай разоркай”. Няма ўжо даўно старога Сенчыка, а ягоная “разорка” так і засталася да сёння.

*(Кулеш, А. Сенчыкава разорка // Лідская газета. – 2006. - 31 студзеня.)*

“ХЛОПЧЫКА НАЗАВІ АДАМАМ, А ДЗЯЎЧЫНКУ ЕВАЙ”

Было гэта можа ў гады 20-я ХХ стагоддзя, у адной жанчыны ўсё паміралі дзеці. Паўгода, год пажывуць і паміраюць. Перажывала надта тая жанчына. Аднавяскоўцы накіравалі яе да ксендза, можа ён што-небудзь параіць. Ксёндз даў наступную параду: “Калі народзіцца хлопчык назаві яго Адам, а народзіцца дзяўчынка назаві Ева”. Так і зрабіла жанчына. Мела яна яшчэ чатырох дзяцей і ўсе яны дажылі да сталасці.

*(Запісалі ад Маціяс Юзэфы Юзэфаўны (1923 г.н.), жыхаркі Ліды)*

ЛІТАРАТУРА

1. Басікевіч, А. Гэтыя невялікія Вялічкі каля возера-крынічкі / А.Басікевіч // Лідская газета. – 1997. - 10 жніўня.

2. Беркус, С. Арлінае гняздо / С.Беркус // Принеманские вести. – 2008. - 10 января.

3. Будревич, В. Исторические тайны. Легенды о родном крае / В.Будревич // Оникс. – 1998. - № 4 (8).

4. Гродзеншчына: Назвы населеных пунктаў паводле легендаў і паданняў (Склад., запіс., апрац. А.М.Ненадаўца). - Мн.: Беларусь, 1999.

5. Дучыц, Л. Што ў паданнях і назвах / Л.Дучыц // Лідская газета. - 1989. - 21 лістапада.

6. Крачковский, Ю.Ф. Быт западно-русского селянина // Чтения в О-ве истории и древностей российских при Московском университете. 1873. К.4. М., 1874.

7. Кулеш, А. Горад Ліда: гістарычныя крокі развіцця / А.Кулеш // Гродзенская праўда. – 2000. - 24 кастрычніка.

8. Кулеш, А. Сенчыкава разорка / А.Кулеш // Лідская газета. – 2006. - 31 студзеня.

9. Легенды і паданні / [Склад. М.Я.Грынблат і А.І.Гурскі; рэд. Тома А.С.Фядосік]. – 2-е выд., дап. і дапрац. – Мн.: Бел. навука, 2005. – 552 с.

10. Лідчына // Наша слова. – 2006. - 19 ліпеня.

11. Лідчына // Наша слова. – 2006. - 26 ліпеня.

12. Маліноўскі, М. Ці гудзеў Гуд у Гудах / М.Маліноўскі // Лідская газета – 1998. - 25 ліпеня.

13. Маліноўскі, М. Канец жорсткага ўладара / М.Маліноўскі // Лідская газета – 1998. - 22 жніўня.

14. Памяць: Ліда. Лідскі раён: Гіст.-дак. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. Мн.: Беларусь, 2004. – 566 с.: іл.

15. Петрулевіч, Л. Каплічка ля Цвермаў / Л.Петрулевіч // Лідская газета. – 2010. - 12 жніўня.

16. Сліўкін, В. Будаўніцтва Лідскага замка і ўладкаванне прылеглай тэрыторыі (14 – 15 стагоддзі) / В.Сліўкін // Лідскі летапісец. - 2006. - № 4 (36).

17. Сліўкін, В. Тарнова / В.Сліўкін // Лідскі летапісец. – 2005 - №1-2. – С.86.

18. Содаль, У. "… Сем раз Ліду ён адведаў" / У.Содаль // Лідская газета. – 2007. - 14 ліпеня.

19. Тополь, А. Легенда / А.Тополь // Лідская газета. – 1980. - 16 лістапада.

20. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 3. Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн. 2 / Боганева А.М., Козенка М.А., Лабачэўская В.А. – Мн.: Вышэйшая школа, 2006. – 736 с.: каляр. іл.

21. Черепица, В.Н. Очерки истории Православной Церкви на Гродненщине (с древнейших времён до наших дней). Монография: часть II. – Гродно: ГрГУ, 1995. – 440 с.

22. Черноус, Т. В Лидском замке … привидение? / Т.Черноус // Лідская газета. – 2007. - 24 сакавіка.

23. Хітрун, А. Беларускі народны эпас Лідчыны: матывы і вобраз / А.Хітрун // Лідскі летапісец. – 2010 - №3 (51). – С.48-63.

24. Шаўчэнка, М.Б. "Пляснуўся з неба Цмок…"// Онікс, 2010.

25. Швед, В. Абаронца зямлі беларускай / В.Швед // Лідская газета. - 2004. - 3 красавіка.

ДАДАТАК 1

Ліда



ДАДАТАК 2

Ліда



ДАДАТАК 3

Будаўніцтва Лідскага замку



ДАДАТАК 4

Дзве сасны



Сосны ля Лідскага замка



ДАДАТАК 5

Сосны ля замка на старых фотаздымках






ДАДАТАК 6

Каралеўскі ўезд у Лідскі замак



ДАДАТАК 7

Прывіды Лідскага замка



ДАДАТАК 8

Тахтамышаў скарб



ДАДАТАК 9

Герб горада Ліды



“Леў з ключамі” скульптура У.Жбанава



ДАДАТАК 10

“І бузде іграць музыка на могілках немаўлят”




ДАДАТАК 11

Рака Лідзейка









ДАДАТАК 12

Закасанка



ДАДАТАК 13

Беліца



ДАДАТАК 14

Бярозаўка




ДАДАТАК 15

Гуды




ДАДАТАК 16

Дворышча




ДАДАТАК 17

Крупава




ДАДАТАК 18

Крыніца




ДАДАТАК 19

Леснікі




ДАДАТАК 20

Мацэвічы




ДАДАТАК 21

Мыто


МЫТО

# ДАДАТАК 22

Вялічкаўскае возера





ДАДАТАК 23

Ксендзова возера




Ксендзова возера

ДАДАТАК 24

Дварышчанская башня – сведка жорсткага забойства





Фігурка Езуса Хрыстуса на старых могілках у Дворышчах

ДАДАТАК 25

Шведская гара




ДАДАТАК 26

Абраз Божай Маці ў  Белагрудскім касцёле







ДАДАТАК 27

Камень-следавік у Бабрах


КАМЕНЬ СЛЕДАВІК
У БАБРАХ



Царква Уздвіжання Крыжа Гасподня





Камень-следавік

ДАДАТАК 28

Капліца ў Цвермах









ДАДАТАК 29

Крыніца на былым Кацярынінскім тракце





ДАДАТАК 30

Тарнова



ДАДАТАК 31

Храм у весцы Дзікушкі





